СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ДРУГІМ КВАРТАЛЕ!

Заканчваецца падпіска на II квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	8800	26400	52800
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	8300	24900	49800
63858 (ведамасны)	14000	42000	84000
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	12800	38400	76800

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 САКАВІКА 2008 г. СУБОТА

№ 60 (26173)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 сакавіка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфераў дзейнасці: рабочым, спецыялістам, кіраўнікам прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, будаўнікам, урачам, педагогам, вучоным, работнікам культуры і мастацтва, ваеннаслужачым Узброеных Сілаў і прадстаўнікам органаў унутраных спраў, журналістам і дзяржаўным служачым.

«У самых розных галінах народнай гаспадаркі Беларусі людзі працуюць добрасумленна, у поўную сілу, творча ўкараняючы перадавыя прыёмы і тэхналогіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прысутных.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны старшыня СВК «Скабін» Капыльскага раёна Анатоль Буцько і рэктар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Іван Жарскі.

Прэзідэнт асабліва адзначыў значны ўклад сельскіх працаўнікоў у забеспячэнне харчовай бяспекі краіны. Кіраўнік дзяржавы ўручыў узнагароды лепшым прадстаўнікам Мінскай вобласці, якая ўтрымлівае першынство ў рэспубліцы па новых комплексных паказчыках эфектыўнасці працы.

Уручаючы дзяржаўныя ўзнагароды работнікам РУП «ВА «Беларуснафта», Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «У сучасных умовах асабліваю каштоўнасць для краіны ўяўляе кожная здабытая тона айчыннай нафты».

Медалёў удастоены работнікі Беларускага аўтамабільнага завода, Рэчыцкага метызнага завода, прадпрыемства «ВІПРА» і ААТ «Белфа» за распрацоўку і ўкараненне сучасных тэхналогій вытворчасці, выпуск новай прадукцыі, эканомію рэсурсаў і высокую прадукцыйнасць працы.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў ордэны «За службу Радзіме» II і III ступені супрацоўнікам унутраных войскаў, ваеннаслужачым Узброеных Сілаў. «Усе мы разумеем, наколькі важныя для паспяховага развіцця краіны забеспячэнне яе абароназдольнасці і грамадскага парадку, абарона інтарэсаў грамадзян і дзяржавы, спыненне крыміналу і злачыннасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Медалём Францыска Скарыны адзначаны беларусы з Расіі за вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне творчых і дружалюбных сувязяў паміж брацкімі народамі. «Не памылюся, калі скажу, што ваша работа не менш важная, чым дыпламатычная, — сказаў Прэзідэнт. — Папулярызуючы беларускую культурную спадчыну за мяжой, з'яўляючыся своеасаблівымі пасламі добрай волі, вы ствараеце прывабны вобраз сваёй Беларусі, раскрываеце мудры, спакойны, міралюбівы і стваральны характар нашай цудоўнай Радзімы».

Медаль Францыска Скарыны ўручана генеральнаму дырэктару ТАА «Кёнігсберг Трэйдынг» Міхаілу Грыбу, старшыні савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Францішку Каўрыгу, мастацкаму кіраўніку грамадскага творчага саюза «Славянскае кола» Сяргею Костачку, старшыні савета нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусь» у Рэспубліцы Комі Аркадзю Крупеньку, намесніку дырэктара па культуры Новасібірскай гарадской грамадскай арганізацыі «Беларускі культурна-асветны цэнтр у імя святой Ефрасінні Полацкай» Людміле Счаслівенка.

«Не магу не парадавацца ў Год здароўя і поспехам нашых медыцынскіх работнікаў, асабліва ў галіне аховы дзяцінства і мацярынства», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прысутных.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны старшыня СВК «Скабін» Капыльскага раёна Анатоль Буцько і рэктар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Іван Жарскі.

Прэзідэнт асабліва адзначыў значны ўклад сельскіх працаўнікоў у забеспячэнне харчовай бяспекі краіны. Кіраўнік дзяржавы ўручыў узнагароды лепшым прадстаўнікам Мінскай вобласці, якая ўтрымлівае першынство ў рэспубліцы па новых комплексных паказчыках эфектыўнасці працы.

Уручаючы дзяржаўныя ўзнагароды работнікам РУП «ВА «Беларуснафта», Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «У сучасных умовах асабліваю каштоўнасць для краіны ўяўляе кожная здабытая тона айчыннай нафты».

Медалёў удастоены работнікі Беларускага аўтамабільнага завода, Рэчыцкага метызнага завода, прадпрыемства «ВІПРА» і ААТ «Белфа» за распрацоўку і ўкараненне сучасных тэхналогій вытворчасці, выпуск новай прадукцыі, эканомію рэсурсаў і высокую прадукцыйнасць працы.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў ордэны «За службу Радзіме» II і III ступені супрацоўнікам унутраных войскаў, ваеннаслужачым Узброеных Сілаў. «Усе мы разумеем, наколькі важныя для паспяховага развіцця краіны забеспячэнне яе абароназдольнасці і грамадскага парадку, абарона інтарэсаў грамадзян і дзяржавы, спыненне крыміналу і злачыннасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Медалём Францыска Скарыны адзначаны беларусы з Расіі за вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне творчых і дружалюбных сувязяў паміж брацкімі народамі. «Не памылюся, калі скажу, што ваша работа не менш важная, чым дыпламатычная, — сказаў Прэзідэнт. — Папулярызуючы беларускую культурную спадчыну за мяжой, з'яўляючыся своеасаблівымі пасламі добрай волі, вы ствараеце прывабны вобраз сваёй Беларусі, раскрываеце мудры, спакойны, міралюбівы і стваральны характар нашай цудоўнай Радзімы».

Медаль Францыска Скарыны ўручана генеральнаму дырэктару ТАА «Кёнігсберг Трэйдынг» Міхаілу Грыбу, старшыні савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Францішку Каўрыгу, мастацкаму кіраўніку грамадскага творчага саюза «Славянскае кола» Сяргею Костачку, старшыні савета нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусь» у Рэспубліцы Комі Аркадзю Крупеньку, намесніку дырэктара па культуры Новасібірскай гарадской грамадскай арганізацыі «Беларускі культурна-асветны цэнтр у імя святой Ефрасінні Полацкай» Людміле Счаслівенка.

На мінскай вуліцы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧАС НЕ СПЫНІШ, А ПЕРАВЕСЦІ — ТРЭБА

У Беларусі 30 сакавіка 2008 года будзе ажыццёўлены пераход на «летні» час у адпаведнасці з парадкам вылічэння часу, вызначаным пастановай урада ад 13 мая 1996 года № 317, паведамілі ў Дзяржстандарце Беларусі. 30 сакавіка 2008 года ў 2 гадзіны ночы стрэлкі гадзіннікаў пераводзяцца на адну гадзіну наперад.

Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы ўручае медаль Францыска Скарыны рэдактару аддзела фотаілюстрацый газеты «Звязда» Яўгену ПЯСЕЦКАМУ. Яшчэ раз віншуем калегу!

«Лукойл» мае намер рэалізаваць у Беларусі новыя буйныя праекты

Беларусь і «Лукойл» плануюць пашырыць супрацоўніцтва і рэалізаваць новыя буйныя сумесныя праекты. Канкрэтныя інвестыцыйныя планы абмеркаваў 28 сакавіка кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка з прэзідэнтам ААТ «Нафтавая кампанія «Лукойл» Вагітам Алекперавым.

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Прэзідэнта краіны, гэта сустрэча стала працягам серыі перагавораў беларускага боку з буйнымі замежнымі інвестарамі.

«Лукойл» з'яўляецца самай буйной прыватнай нафтагазавай кампаніяй у свеце па памеры даказаных запасаў вуглевадародаў. Аляксандр Лукашэнка даў пазітыўную ацэнку цяперашняму ўзаемадзеянню Беларусі з «Лукойлам». «Мы без праблем развіваем узаемаадносіны, і нашы дамоўленасці выконваюцца. Тым не менш, наша сустрэча павінна высветліць некаторыя пытанні па існуючых дамоўленасцях», — адзначыў кіраўнік дзяржавы ў размове з Вагітам Алекперавым. «Мы і далей будзем развіваць супрацоўніцтва, арыентуючыся на вашу кампанію, тым больш што «Лукойл» пачаў займацца і прыродным газам. Мы гатовы папрацаваць у гэтым напрамку», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Вагіт Алекпераў асабліва падкрэсліў, што лічыць Беларусь прывабным рынкам, дзе створаны інвестыцыйныя асновы для ўкладання капіталу. Ён праінфармаваў Прэзідэнта аб тым, што дзеючае ў Беларусі суменае прадпрыемства па вытворчасці прысадак за тры гады амаль у 10 разоў павялічыла аб'ём вытворчасці і змагло выйсці на рынкі не толькі Беларусі і Расіі, але і трэціх краін.

«За мінулы год кампанія ўвайшла ў пяцёрку самых буйных падаткаплацельшчыкаў у рэспубліцы. Пачатыя праекты паспяхова развіваюцца, — падкрэсліў Вагіт Алекпераў. — Спадзяёмся, што нашы далейшыя ініцыятывы, адносна якіх мы хочам з вамі параіцца, знойдуць падтрымку і будуць рэалізаваны».

Паводле яго слоў, падрыхтаваны ўжо і разглядаюцца буйныя праекты, якія запатрабуюць значных капіталаўкладанняў. «Мы лічым, што Беларусь — гэта адзін з найбуйнейшых транзітных і перспектыўных рынкаў, таму кампанія прадаўжае далейшае развіццё сваёй дзейнасці на тэрыторыі рэспублікі», — заявіў Вагіт Алекпераў. У прыватнасці, «Лукойл» прапанаваў даручыць дзеючаму сумеснаму прадпрыемству ў Наваполацку, што створана на парытэтных пачатках з беларускімі партнёрамі і займаецца вытворчасцю прысадак, выпуск і рэалізацыю змазачных матэрыялаў. Прэзідэнт Беларусі адобрыў стварэнне адпаведнай рабочай групы для падрыхтоўкі тэхніка-эканамічнага абгрунтавання гэтага праекта. «Лукойл» таксама мае намер інвеставаць у стварэнне дадатковых аўтазаправачных станцый у рэспубліцы.

СТРЭЛКІ, НАПЕРАД!

Аказваецца, такая звыклая справа, як перавод гадзінніка, выклікала ў свой час шмат спрэчак. Калі Бенджамін Франклін прапанаваў перайсці на «час па эканоміі дзённага святла», яго практычна ніхто не паслухаў. Між тым прапанова мела пад сабой рэальны эканамічны разлік. Вясной 1784 года, будучы паслом у Парыжы, Франклін падлічыў колькасць спажываемых васковых свечак, і прыйшоў да высновы: калі б светлавы дзень доўжыўся хоць на гадзіну больш, французскія ўладальнікі крамаў маглі б зэканоміць 90 мільёнаў свечак агульным коштам у 1 мільён залатых франкаў!

Напачатку 80-х гадоў XIX стагоддзя знайшоўся, аднак, больш настойлівы спадар — інжынер-сувязіст Стэнфард Флемінг, які прапанаваў, каб упарадкаваць час, увесці часавыя паясы. У 1883 годзе ўрад ЗША адобрыў ідэю: планету падзялілі на 24 часавыя паясы, па 15 градусаў у кожным. У гэты ж час было вырашана лічыць сярэдзінай нулявога поясу Грынвіцкі мерыдыян.

Пазней над рацыянальным выкарыстаннем дзённага святла задумаўся лонданскі падрадчык Уільям Уілет, які ў 1907 годзе нават апублікаваў памфлет «Аб растранжыранні дзённага святла». Ён першым у свеце прапанаваў пераводзіць гадзіннік на 20 хвілін наперад у кожную нядзелю красавіка, а ў кожную нядзелю кастрычніка — на 20 хвілін назад. Праз 2 гады англічане вырашылі, што працей вясной і восенню перавесці стрэлкі адзін раз — на гадзіну.

Найбольш кансерватыўнай у гэтым плане — аж да 1918 года — заставалася Расія. Але і тут з прыходам бальшавікоў быў выдадзены спецыяльны дэкрэт, які падзяляў краіну на 11 часавых паясоў, а таксама прадугледжваў перавод стрэлак гадзінніка двойчы ў год. Што мы робім і зараз, нягледзячы на падзел чалавецтва на «соў» ды «жаўрукоў».

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Медыцына — галіна нацыянальнай бяспекі

Учора ў малой зале Палаца Рэспублікі прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і лаўрэатаў конкурсу на званне «Лепшы ўрач 2007 года», а таксама рэспубліканскага агляду якасці і культуры медыцынскага абслугоўвання насельніцтва.

Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Аляксандр Косінец, дарэчы, сам урач-хірург, падкрэсліў у сваім выступленні важнасць для грамадства штодзённай карпатлівай працы медыкаў. Цяжка спрачацца з меркаваннем, што нягледзячы на шматлікія імёны славутых дактароў, якія бережліва захоўвае гісторыя беларускай медыцыны, кожны пацыент памятае свайго доктара, таго, хто вылечыў яго і выратаваў яму жыццё.

— Звяртаю вашу ўвагу на тую акалічнасць, што кіраўніком нашай дзяржавы перад сістэмай аховы здароўя пастаўлена канкрэтная задача — выйсці да 2011 года на перадавыя пазіцыі сучаснай медыцыны і цалкам адпавядаць сусветным стандартам, — звярнуўся да прысутных у зале Аляксандр Косінец. — Ужо сёння па многіх пазіцыях, такіх напрыклад, як смяротнасць немаўлят і мацярынская смяротнасць, мы дасягнулі ўзроўню эканамічна высокаразвітых краін свету. За два месяцы гэтага года паказчык смяротнасці немаўлят склаў усяго 4 праміле — гэта самы лепшы паказчык за ўсю гісторыю айчыннай акушэрскай службы.

Нядаўна беларускі ўрад выйшаў з прапановай накіраваць заробленыя на рэспубліканскім суботніку сродкі ў медыцынскую галіну: 50 працэнтаў усіх сродкаў накіраваць на развіццё службы хуткай медыцынскай дапамогі — для закупкі рэанімабіляў, а другую частку грошай накіраваць на будаўніцтва, рэканструкцыю, умацаванне дыягнастычнай і матэрыяльнай базы дзіцячых бальніц.

Конкурс на званне «Лепшы ўрач года» праводзіўся ўпершыню. Як падкрэсліў у сваім выступленні міністр аховы здароўя Васіль Жарко, яны будуць цяпер праходзіць не радзей чым адзін раз у два гады.

Лепшым урачом-педыятрам быў прызнаны загадчык дзіцячай кансультацыі Горацкай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксандр Маргунскі. У намінацыі «Урач-тэрапеўт» перамагла загадчыца гастраэнтэралагічным аддзяленнем 6-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Тацяна Малая, у намінацыі «Урач-хірург» — урач мікрахірургічнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Сяргей Мячкоўскі, у намінацыі «Урач-акушэр-гінеколаг» — загадчык гінекалагічным аддзяленнем 4-й клінічнай бальніцы г. Гродна Андрэй Касцяхін, а ў намінацыі «Урач агульнай практыкі» — загадчык Астрамечаўскай урачэбнай амбулаторыі Брэсцкай гарадской бальніцы Ніна Суліма.

Пераможцай агляду якасці і культуры медыцынскага абслугоўвання насельніцтва сярод адміністрацыйных тэрыторый стала сталічная сістэма аховы здароўя. Ганаровае другое месца — у сістэмы аховы здароўя Магілёўскай вобласці, а трэцяе — у медыкаў Брэсцкай вобласці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

15 ГАДОЎ ЗНЯВОЛЕННЯ — ПРЫСУД НЕПАЎНАГАДОВАМУ ЗАБОЙЦУ

У Бабруйску вынесены прысуд у гучнай справе забойства 10-гадовага хлопчыка ў леташнім жніўні. Калі хлопчык знік, у яго маці вымагалі некалькі тысяч долараў за вяртанне сына. Цела малога было знойдзена праз некалькі дзён: яго гвалтоўна ўтапілі.

Суд быў закрытым, але прысуд калегія па крымінальных справах Магілёўскага абласнога суда аб'явіла ў адкрытым пасяджэнні. Вучань адной з бабруйскіх школ, 1993 года нараджэння, прызнаны вінаватым у наўмысным забойстве малагадовага з асаблівай жорсткасцю, а таксама ў крадзяжы, разбоі і вымаганні. sПакаранне — 15 гадоў зняволення, з адбываннем у выхаваўчай калоніі. Вынесены прысуд яшчэ можа быць абскарджаны.

Алена КАЗЛОВА.

МАЁМАСЦЬ — ПА ЗАНІЖАНЫМ КОШЦЕ

У Гомелі супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС затрымана 48-гадовая адказная асоба ААТ «Парыцкі кансервавы завод».

Гэты жыхар Светлагорскага раёна падазраецца ў тым, што атрымаў ад нідзе не працуючага мясцовага жыхара хабар у памеры 2 тысяч долараў ЗША. Як мяркуецца, за гэтую суму адказная асоба бралася вырашыць пытанне аб продажы маёмасці таварыства (яно праходзіць працэдуру банкруцтва) па заніжаным кошце.

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

ЗНОЎ УКРАЛІ САЛЯРКУ?

На гэты раз у Баранавічах на вуліцы Савецкай супрацоўнікі па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі выявілі 11 693 літры дызпаліва, на якое не было дакументаў.

Салярку на суму амаль у 20 мільёнаў рублёў канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Копыльском райисполкоме, проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства имущества: Лот № 1: асфальтобетонная площадка № 2, расположенная по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, д. Тимковичи, начальная цена — 38 257 059 белорусских рублей; Лот № 2: артскважина с камерой и насосом, железнодорожный путь со стрелочным переводом — 471,5 м, ограждение производственной базы — 459,19 м, кран-балка, кран козловой КК-12,5-25, расположенные в д. Тимковичи, начальная цена — 122 255 341 белорусских рублей; Лот № 3: здание проходной об. пл. 31,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Копыль, ул. Тимковичская, 1 «А», начальная цена — 6 943 398 белорусских рублей. Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объекты продаются без условий. Переход прав на земельный участок будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 30.04.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Копыль, пл. Ленина, д. 6, актовый зал. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 29.04.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН (8017) 2246134.

САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY

УНП 690 324015.

У адносінах паміж Беларуссю і ЗША эканамічныя інтарэсы будуць пераважаць над палітычнымі

Аб гэтым заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Вадзім Папоў на прэс-канферэнцыі. Спікер падкрэсліў, што «эканоміка ЗША развіваецца па агульнапрызнаных сусветных канонах, а не па жаданні асобных людзей». Эканамічнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЗША развіваецца ўстойліва, па ўзыходняй, назіраецца дынаміка росту знешнегандлёвых адносінаў, дадаў ён. «Думаю, што пройдзе некаторы час і ўсе канфліктныя сітуацыі ўлягуцца. Эканамічная частка падштурхоўвае да прыняцця больш канструктыўных палітычных рашэнняў», — сказаў Вадзім Папоў.

Беларуска-расійскія адносіны калі і зменяцца, то толькі ў лепшы бок. Аб гэтым заявіў Вадзім Папоў, адказваючы на пытанне аб развіцці двухбаковага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі пасля праведзеных у РФ прэзідэнцкіх выбараў. «Песімістычных настрояў наконт узаемадзеяння ў рамках Саюза Беларусі і Расіі няма. Саюзны ўрад працуе без зрываў», — падкрэсліў Вадзім Папоў. Палата прадстаўнікоў плануе разгледзець на маючай адбыцца вясновай сесіі больш за 100 пытанняў. «Цэнтральнай падзеяй вясновай сесіі будзе пасланне кіраўніка дзяржавы беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу», — адзначыў Вадзім Папоў.

БЕЛТА.

Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання пачне сваю работу 2 красавіка 2008 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 красавіка 2008 года з 8.30 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

Валерый ПІНЧУК, кіраўнік адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска:

«АЎТАРЫТЭТ АЦЭНЬВАЕЦЦА ПА РЭАЛЬНЫХ СПРАВАХ»

Пастановай ЦВК БССР ад 17 сакавіка 1938 года ў Мінску былі ўтвораны тры раёны. Адзін з іх — Савецкі (цікава, што да 1961-га меў назву Варашылаўскі), ад якога з цягам часу ўтварыліся яшчэ Першамайскі і Цэнтральны. Адміністрацыйны падзел сталіцы напрамую залежаў ад імклівага росту насельніцтва. Савецкі раён здаўна называюць «залатой сярэдзінкай» Мінска, тут арганічна спалучаюцца арыгінальнае архітэктурнае аблічча жылых кварталаў і шматлікія гандлёвыя, прамысловыя, адукацыйныя, культурныя ўстановы. Чым характарызуецца цяперашняе сацыяльна-эканамічнае развіццё, якія планы на перспектыву? На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае кіраўнік адміністрацыі Савецкага раёна сталіцы Валерый ПІНЧУК.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«СЯРЭДНІ ЗАРОБАК ПЕРАВЫСІЎ 500 ДОЛАРАЎ»

— Па плошчы Савецкі раён адзін з самых невялікіх у Мінску — крыху больш, чым 2,3 тысячы гектараў. Тут жывуць каля 170 тысяч чалавек (9,3 працэнта ўсяго насельніцтва Мінска). Аднак гэтыя «пашпартныя» даныя наўрад ці могуць у поўнай меры ахарактарызаваць месца і ролю адміністрацыйнай тэрыторыі. Нягледзячы на тое, што ўдзельная вага прамысловасці раёна ў агульных аб'ёмах горада складае 5,3 працэнта, прадукцыя многіх прадпрыемстваў (усяго іх 23) добра вядомая далёка за межамі Беларусі — ад высокіх інфармацыйных тэхналогій да ўнікальнай дарожна-будаўнічай тэхнікі. Дарэчы, яшчэ ў 2001-м наша доля была 3,1 працэнта, так што патэнцыял увесь час павялічваецца. За апошнія пяць гадоў аб'ёмы прамысловай вытворчасці ўзраслі ў 2,2 раза. У тым жа 2001 г. усім добра вядомы «Амкадор» быў поўным банкрутам.

Дарэчы, мой трэці працоўны дзень на пасадзе кіраўніка раёна быў адзначаны непрыемнай падзеяй — на гэтым прадпрыемстве не выплацілі зарплату і рабочыя мелі намер перакрываць цэнтральны праспект. Тады неяк удалося знайсці выйсце са складанай сітуацыі. Цяпер ААТ «Амкадор» — прызнаны лідар у машынабудаванні, адзін з сапраўдных брэндаў нашай дзяржавы. Па аб'ёмах вытворчасці прадукцыі прадпрыемства штогод прырастала амаль на чвэрць. Так што сітуацыя відавочна мяняецца да лепшага — такое становішча на многіх прадпрыемствах прамысловай галіны, — сказаў суразмоўца.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08060

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.03.2008 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	3 381,27
1 латвійскі лат	4 852,39
1 літоўскі літ	979,32
1 чэшская крона	133,88
1 польскі злоты	958,40
1 расійскі рубель	91,22
1 украінская грыўня	429,86

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
Цэнтрабанк РФ	
USD	23,5156
10 UAH	46,6256
1000 BYR	10,9458
EUR	37,0676
Курс у гандлёвых кампаніях (на 28.03.2008 г.)	
USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УСТУПЛЕННЕ ГРУЗІІ І УКРАІНЫ Ў НАТА РАСШЧАПЛЯЕ АЛЬЯНС

Вострая трансатлантычная спрэчка вакол прыняцця новых членаў НАТА негатыўна адаб'ецца на саміце Альянсу, які пройдзе 2—4 красавіка ў Бухарэсце. Нягледзячы на папераджальныя сігналы з Берліна, прэзідэнт ЗША Джордж Буш настойвае на тым, каб прапанаваць далучыцца да Плана дзеянняў па ўступленні ў Альянс як Грузіі, так і Украіне.

Гэты План дзеянняў з'яўляецца першай прыступкай для членства ў НАТА. Большасць усходнееўрапейскіх краін і Канада падтрымліваюць Злучаныя Штаты, у той час як Германія, Францыя, Італія і Іспанія выказваюцца катэгарычна супраць.

ПРЭЗІДЭНТ УКРАІНЫ ЮШЧАНКА ПАЛЁТАЎ НА СУ-27

Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка падчас наведванняў 40-й брыгады тактычнай авіяцыі паветранага камандавання «Цэнтр» Паветраных сілаў Украіны ў пятніцу здзейсніў палёт на знішчальніку Су-27.

Пілатаваў самалёт намеснік камандуючага Паветранымі ўзброенымі сіламі Украіны генерал-маёр Васіль Нічыпараў. Прэзідэнт Украіны знаходзіўся ў паветры 35 хвілін. Нагадаем, што ў канцы лютага Юшчанка, наведваючы ваенны палігон у Чарнігаўскай вобласці, пракаціўся на танку — мадэрнізаванай версіі савецкага Т-64, названай ва Украіне «Булат».

РЫЗЫКА ПРЫДУРКАВАТАСЦІ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ПАМЕРУ ЖЫВАТА

Людзі, якія маюць вялікі жывот у 40 гадоў, часцей пакутуюць ад хваробы Альцгеймера і іншых формаў прыдуркаватасці ў сталым веку.

Даследчыкі цэнтра Kaiser Permanente (Каліфорнія) вымяралі таўшчыню падскурнага тлушчавага пласта на жывоце ў 6583 добраахвотнікаў ва ўзросце ад 40 да 45 гадоў. Назіранне за імі вялося на працягу 36 гадоў. Аналіз сабраных звестак паказаў, што спалучэнне залішняй вагі і вялікага жывата павялічвала рызыку развіцця прыдуркаватасці ў 2,3 раза. Людзі, якія пакутуюць ад атлусцення і маюць вялікі жывот, захворвалі на прыдуркаватасць у 3,6 раза часцей, чым людзі з нармальнай вагой і аб'ёмам таліі. Больш за тое, вялікі жывот спрыяў развіццю прыдуркаватасці нават пры нармальнай масе цела — у гэтым выпадку рызыка захворвання павялічвалася на 90 працэнтаў, паведамілі даследчыкі.

Прэзідэнт выказаў спачуванні Віктару Юшчанку

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні прэзідэнту Украіны Віктару Юшчанку, родным і блізкім загінулых у выніку аварыі верталёта Мі-8 Дзяржаўнай пагранічнай службы Украіны.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

КРОНІКА ЗВЯЗДЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 28 сакавіка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфераў дзейнасці: рабочым, спецыялістам, кіраўнікам прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, будаўнікам, урачам, педагогам, вучоным, работнікам культуры і мастацтва, ваеннаслужачым Узброеных Сілаў і прадстаўнікам органаў унутраных спраў, журналістам і дзяржаўным служачым.

«У самых розных галінах народнай гаспадаркі Беларусі людзі працуюць добрасумленна, у поўную сілу, творча ўкараняючы перадавыя прыёмы і тэхналогіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да прысутных.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны старшыня СВК «Скабін» Капыльскага раёна Анатоль Буцько і рэктар Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Іван Жарскі.

Прэзідэнт асабліва адзначыў значны ўклад сельскіх працаўнікоў у забеспячэнне харчовай бяспекі краіны. Кіраўнік дзяржавы ўручыў узнагароды лепшым прадстаўнікам Мінскай вобласці, якая ўтрымлівае першынство ў рэспубліцы па новых комплексных паказчыках эфектыўнасці працы.

Уручаючы дзяржаўныя ўзнагароды работнікам РУП «ВА «Беларуснафта», Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «У сучасных умовах асабліваю каштоўнасць для краіны ўяўляе кожная здабытая тона айчыннай нафты».

Медалёў удастоены работнікі Беларускага аўтамабільнага завода, Рэчыцкага метызнага завода, прадпрыемства «ВІПРА» і ААТ «Белфа» за распрацоўку і ўкараненне сучасных тэхналогій вытворчасці, выпуск новай прадукцыі, эканомію рэсурсаў і высокую прадукцыйнасць працы.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў ордэны «За службу Радзіме» II і III ступені супрацоўнікам унутраных войскаў, ваеннаслужачым Узброеных Сілаў. «Усе мы разумеем, наколькі важныя для паспяховага развіцця краіны забеспячэнне яе абароназдольнасці і грамадскага парадку, абарона інтарэсаў грамадзян і дзяржавы, спыненне крыміналу і злачыннасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Медалём Францыска Скарыны адзначаны беларусы з Расіі за вялікі асабісты ўклад ва ўмацаванне творчых і дружалюбных сувязяў паміж брацкімі народамі. «Не памылюся, калі скажу, што ваша работа не менш важная, чым дыпламатычная, — сказаў Прэзідэнт. — Папулярызуючы беларускую культурную спадчыну за мяжой, з'яўляючыся своеасаблівымі пасламі добрай волі, вы ствараеце прывабны вобраз сваёй Беларусі, раскрываеце мудры, спакойны, міралюбівы і стваральны характар нашай цудоўнай Радзімы».

Медаль Францыска Скарыны ўручана генеральнаму дырэктару ТАА «Кёнігсберг Трэйдынг» Міхаілу Грыбу, старшыні савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Францішку Каўрыгу, мастацкаму кіраўніку грамадскага творчага саюза «Славянскае кола» Сяргею Костачку, старшыні савета нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусь» у Рэспубліцы Комі Аркадзю Крупеньку, намесніку дырэктара па культуры Новасібірскай гарадской грамадскай арганізацыі «Беларускі культурна-асветны цэнтр у імя святой Ефрасінні Полацкай» Людміле Счаслівенка.

Скарбонка

ЗБЕРАЖЭННІ СА ЗНАКАМ «МІНУС»

За тры гады «заначкі» ў доларах «пахудзелі» на чвэрць, а вось лідарства па даходнасці — за золатам у злітках

«Слухай, — звярнуўся да мяне добра знаёмы, — нешта апошнім часам мяне ўсё менш цешыць капітал, назапашаны і прыхаваны дома. Быццам бы і сума вялікая, больш за 10 тысяч долараў назбіраў, але... Ведаеш, гэтыя грошы пад матрацам вельмі цудоўна захоўваюць сваю форму, ды толькі з кожным днём катастрафічна абясцэньваюцца. У банк іх занесці, ці што?.. Можа нешта параіш?..»

Прызнацца, зусім не здзівіўся, калі даведаўся пра яго «праблемы» з грашыма: людзей, якія захоўваюць дома свае зберажэнні, застаецца яшчэ даволі шмат (некаторыя эксперты мяркуюць, што беларусы трымаюць на руках да 2 мільярдаў долараў у эквіваленце, не рызыкуючы ўкладваць іх у банкі ці траціць на нешта іншае). Што далёка хадзіць: некалі і сам не вырашаўся эксперыментаваць з дэпазітамі, добра памятаючы падзеі сумнавядомага 1991 года, калі бацькі ў адно імгненне страцілі ўсё, што збіралі больш за 30 гадоў. А таму, калі мог — адкладваў у скарбонку сродкі ў валюце (такое зберажэнне ў той час падавалася больш надзейным), потым «стратэгічны запас» пайшоў на будаўніцтва кватэры, затым набыў з «багаж

ГОДОВАЯ ОТЧЕТНОСТЬ

ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 01.01. 2008 г.

тыс. руб.

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
АКТИВ			
1. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	19661020	20577010
Нематериальные активы	120	17343	11929
Вложения во внеоборотные активы	140	541310	1046528
Прочие внеоборотные активы	150	182684	
Итого по разделу 1	190	20402357	21635467
2. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	25845795	19248196
Налоги по приобретенным активам	220	3228967	1363128
Дебиторская задолженность	230	20539959	10120830
Денежные средства	250	343364	1406141
Финансовые вложения	260	45000	507624
Прочие оборотные активы	270	376654	992137
Итого по разделу 2	290	50379739	33638056
БАЛАНС	**300**	**70782096**	**55273523**
ПАССИВ			
3. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	9000000	9000000
Резервный фонд	420	1087563	792503
Добавочный фонд	430	7109096	8848678
Нераспределенная прибыль	450	8867220	7271707
Доходы будущих периодов	470	10005	18738
Итого по разделу 3	490	26073884	25931626
4. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	171872	140413
Краткосрочные кредиты и займы	520	5353514	4282600
Кредиторская задолженность	530	28873097	24868917
Задолженность перед учредителями	540	13432	49967
Прочие виды обязательств	560	10296297	
Итого по разделу 4	590	44708212	29341897
БАЛАНС	**600**	**70782096**	**55273523**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

тыс. руб.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	131116748	90128471
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	22932347	15787350
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	108184401	74341121
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	102229877	66016946
Управленческие расходы	040	647096	467157
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	060	5307428	7857018
2. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	070	1422867	1603950
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	1253699	1460653
Операционные расходы	090	1226662	1765243
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	27037	-304590
3. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	1421741	482980
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	1308344	481088
Внереализационные расходы	150	1057379	79668
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	250965	401420
Прибыль (убыток)	200	5585430	7953848
Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	2007635	2377756
Прочие расходы и платежи из прибыли	220	30987	-198448
Чистая прибыль (убыток)	**240**	**3546808**	**5744540**

Количество акционеров — всего 1395, в т.ч. юридических лиц — 1, физических лиц — 1394.

Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде — 840 млн. рублей.

Обеспеченность акции имуществом Общества — 86 тыс. руб.

Количество простых акций, находящихся на балансе Общества — нет.

Просроченная дебиторская задолженность — нет.

Просроченная кредиторская задолженность — нет.

Среднесписочная численность работающих (человек) — 1132.

Основной вид деятельности — строительно-монтажные работы.

Данные отчетности подтверждены аудиторской организацией АООО «Аудитэл»

Генеральный директор **Гайкович И.А.**

Главный бухгалтер **Кулик В.Е.**

УНП 100364117


Фота Анатоля КЛЁШЧУКА.

Крынічны бераг

Жыхар вёскі Будзёнаўка Ашмянскага раёна пенсіянер Іосіф СТАНІЛКА набірае ваду з крыніцы на беразе ракі Ашмянкі.

Ваенная акадэмія падрыхтуе дзяўчын-лётчыц

На сёння ваенныя кадры ў Беларусі рыхтуюць на сямі ваенных факультэтах (пяць з іх у ВНУ Мінска, па адным у Гомелі і Гродне) і чатырох ваенных кафедрах (Віцебску, Гродне і Гомелі) грамадзянскіх ВНУ краіны, але базавай навучальнай ваенай установай застаецца Ваенная акадэмія. Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення ваеннай адукацыі і падрыхтоўкі вайскаў Узброеных Сілаў Беларусі палкоўнік Юрый БУГРЭНКА.

— Сістэма падрыхтоўкі ваенных кадраў настолькі сучасная і якасная, што да нас ужо едуць вучыцца — з Венесуэлы, Казахстана, В'етнама, Лівіі і г. д., — заўважыў палкоўнік Бугрэнка. — Мы не рыхтуем толькі некалькі спецыяльнасцяў, патрэба ў якіх складае 1—2 чалавекі раз у 4 гады (у прыватнасці, дырыжор ваеннага аркестра). Іх мы рыхтуем у Расіі: цяпер там вучыцца 160 беларускіх ваеннаслужачых.

Вось ужо некалькі гадоў запар стабільна высокі агульны конкурс (пяць чалавек на месца і болей) на агульнавайсковым факультэце. Сёлета плануецца павялічыць набор на 100 чалавек. Таксама высокі конкурс на факультэце сувязі і аўтаматызаваных сістэм упраўлення (звыш 3 чалавек на месца), куды могуць паступаць і дзяўчаты. Аднак з гэтага года пяць прадстаўніц прыгожай паловы мае магчымасць трапіць на авіяцыйны факультэт. Паводле слоў начальніка Ваеннай акадэміі генерала-маёра Ігнація Місурагіна, у асноўным неба вабіць дзяўчат, якія займаюцца ў ДТСААФ і маюць налёт 30 гадзін. Для іх ужо чакаецца конкурс два чалавекі на месца.

Сёлетняя асаблівасць прыёмнай кампаніі ў Ваенную акадэмію — тое, што яна пройдзе ў скарочаны тэрмін — з 6 па 18 ліпеня. Конкурс на ваенныя факультэты і кафедры ў грамадзянскіх ВНУ адбудзецца з 12 па 21 ліпеня. Ці будзе пашыраца колькасць грамадзянскіх ВНУ, дзе ёсць ваенныя факультэты і кафедры? «Зараз ва Узброеных Сілах праводзіцца эксперымент — арганізавана праца Гродзенскага тэрытарыяльнага цэнтра падрыхтоўкі ваеннаслужачых. Калі ён атрымаецца, то цэнтры падрыхтоўкі малодшых спецыялістаў і афіцэраў запасу з'явяцца ва ўсіх абласных цэнтрах, а то ў Магілёве наогул няма ваенных устаноў», — тлумачыць палкоўнік Бугрэнка.

Ірына ПРЫМАК.

«КВЕТКІ» З «ПАЎЛІНКАМІ» ДЛЯ ЗОРАК З АНЁЛАМІ

Ёсць такія асаблівыя дні, калі наш тэатральны бамонд адчувае сябе ўласна бамондам: артысты і рэжысёры ідуць у Купалаўскі тэатр і займаюць крэслы ў глядзельнай зале, назіраючы за дзеяннем, якое адбываецца менавіта дзеля іх.

Так Тамара Міронава, актрыса Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы, сёлета ўпэўнілася ў тым, што яна ў вачах іншых — сапраўдная зорка. І атрымала свой прыз — «Хрустальную зорку». «Хрустальнай кветкай» быў прызнаны талент маладога акцёра Тэатра юнага гледача Аляксандра Гладкага, які дэбютаваў летась у ролі князя Уладзіміра ў спектаклі «Палачанка». Самы ганаровы прыз — «Хрустальную Паўлінку» — атрымаў заслужаны артыст Беларусі Міхаіл Дружына, які шмат гадоў прысвяціў беларускай оперы. У той жа час адзначана адданасць лялечнаму тэатру Аляксандра Васько. «Лялечнікі» ў нас, што тыя анёлкі. Хрустальныя...

Упершыню ў цырымонію была ўключана прэмія імя Дуніна-Марцінкевіча. Яе павёз у Віцебск акцёр тэатра імя Якуба Коласа Валянцін Салаўёў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Экалогіі — «так», электрычнасці — «не»

Сёння па ўсім свеце пройдзе так званая Гадзіна Зямлі — масавая экалагічная акцыя. Каб далучыцца да яе, трэба разам з мільёнамі іншых людзей роўна на 1 гадзіну, пачынаючы з 20.00, адмовіцца ад выкарыстання электрычнасці — выключыць святло ды электрапрыборы.

Гэта акцыя, як сцвярджаюць грамадскія актывісты з розных краін, мае на мэце прыцягнуць увагу чалавецтва да праблемы змянення клімату. На дадзены момант шкодныя выкіды ад спальвання вугалю, нафты і газы ў працэсе вытворчасці электраэнергіі складаюць у індустрыяльна развітых краінах амаль 50 працэнтаў. Каб спыніць змяненне клімату, паводле меркавання спецыялістаў, да сярэдзіны XXI стагоддзя гэтыя выкіды павінны зменшыцца хоць бы ў 2 разы.

Упершыню падобная Гадзіна Зямлі прайшла летась, 31 сакавіка. На адну гадзіну ад выкарыстання электрычнасці адмовіліся 2,2 млн жыхароў і 2100 кампаній аўстралійскага горада Сіднея. Гэта дазволіла зменшыць энергавыдаткі горада больш як на 10 працэнтаў за гадзіну. Сёлета, як чакаецца, акцыю падтрымаюць жыхары Мельбурна, Чыкага, Капенгагена, Тэль-Авіва, Таронта, Манілы і Брысбана.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Абзац

■ У Валынскай вобласці ваеннаслужачы тэрміновай службы асобнай механізаванай брыгады 13-га армейскага корпуса Сухапутных войскаў Узброеных Сілаў Украіны, самавольна пакінуўшы месца нясення каравульнай службы, уцёк з часці, прыхапіўшы з сабой аўтамат Калашнікава. Прычынай уцёкаў 20-гадовага ваеннаслужачага, якому заставалася ўсяго тры-чатыры тыдні да заканчэння тэрміну службы, маглі стаць асабістыя праблемы ў адносінах з яго дзяўчынай.

■ **У Калінкавічах на падставе факта грабяжу 60-гадовай жанчыны ўзбуджана крымінальная справа. Ва ўчыненні злачынства падазраецца 14-гадовая навучэнка гімназіі райцэнтра. Як паведамілі ў аддзеле папярэдняга расследавання Калінкавіцкага РАУС, падазроная затрымана. Мяркуецца, што юная асоба дачакалася ў пад'ездзе дома пажылую жанчыну і ўдарыла яе малатком па галаве. Пенсіянерка выпусціла з рук сумку, з якой выпаў кашалёк з Br11 тыс. Узяўшы грошы, гімназістка збегла. Дзяўчына — адзінае дзіця з добрай сям'і.**

■ Англійскі футбаліст Дэвід Бекхэм зарабляе каля 26 тыс. доларaў за кожную хвіліну гульні за свой новы клуб LA Galaxy. З тых часоў, як Дэвід і яго жонка Вікторыя ў ліпені мінулага года перабраліся ў Каліфорнію, Бекхэм паклаў сабе ў кішэнь ужо каля 34 млн доларaў. Пры гэтым у агульнай суме ён гуляў за свой клуб усяго 1300 хвілін.

■ **У Вялікабрытаніі гаспадыня зоамагазіна Анэт Эдвардс выгадавала самага вялікага ў Еўропе труса. Вага трохгадовай самкі Эмі складае больш за 22 кілаграмы, а даўжыня ад носа да кончыка хваста — звыш 1,2 метра. Са слоў гаспадыні, Эмі сілкуецца толькі свежымі прадуктамі — морквай, салатай і сенам. На ўтрыманне жывёліны ў сям'і Эдвардс штодня выдаткоўваецца дзесяць фунтаў стэрлінгаў.**

■ У Разані 1 красавіка 2008 года пройдуць Першыя Алімпійскія гульні дурняў пад дэвізам «Вышэй, глыбей, больш!». Прадстаўнік аргкамітэта гульняў заявіў, што ў спаборніцтвах возьмуць удзел пяць камандаў з Разанскай вобласці і Падмаскоўя. Кожнай камандзе давядзецца прадстаўляць рэальна існуючую або прыдуманую краіну. Адзначаецца, што каманды павінны мець адзіную форму, таблічку з назвай прадстаўленай ёй дзяржавы і іншыя атрыбуты, звыклыя для сапраўднай Алімпіяды.

■ **У ходзе сумеснага рэйду міліцыі і Брэсцкай абласной інспекцыі па ахове жывёльнага і раслiннага свету ў лясным масіве Кобрынскага раёна быў выяўлены факт незаконнага самагонаварэння. Гаспадар міні-завода — жыхар суседняй вёскі — быў затрыманы на месцы з доказамі віны. Каля 200 літраў самагонкі і 2,5 тоны брагі, а таксама непасрэдна сам завод былі знішчаны.**

■ На вадаёме «Падгорнае» Стаўбцоўскага раёна былі затрыманы рабочыя Мінскага трактарнага завода, якія ў начны час з дапамогай светлавога прыбора здабылі 53 асобіны вузкапалага рака. Дарэчы, зараз дзейнічае забарона на яго лоўлю. Прыродным рэсурсам быў нанесены ўрон у буйным памеры — на суму 2 730 000 рублёў. Разглядаецца пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

Поўны абзац



■ **На фатаграфіі — купюра ў 10 мільёнаў зімбабвійскіх долараў у руках невядомага жыхара сталіцы Зімбабве Харарэ. На рынку тут памідоры, напрыклад, каштуюць па 2, 3 і 5 мільёнаў долараў. Беспрацоўе ў краіне складае 80 працэнтаў, а інфляцыя за апошнія месяцы ў Зімбабве, нават па афіцыйных данespecially, перавысіла 100 тысяч працэнтаў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«Гучнае» здарэнне

ЯГО НЕ ВЫШУКВАЕ МІЛІЦЫЯ

Мянцюк — не няўлоўны, ён проста пакуль не патрэбны следству

Галоўны віноўнік надзвычайнага здарэння, якое адбылося на шашы Мінск — Мікашэвічы 2 сакавіка гэтага года, Раман Мянцюк зноў апынуўся ў цэнтры ўвагі айчыннных журналістаў. Днямі з'явіліся звесткі, што кіроўца таго самага «Фальксвагена», які пратараніў «жывую заслону», бясследна знік. Хоць супраць яго ўзбуджана крымінальная справа за грубае парушэнне Правілаў дарожнага руху. Аднак учора падчас сустрэчы з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў абверг гэтую інфармацыю. «Гэта чыстая спекуляцыя. Ніякіх заяў аб вышуку гэтага чалавека да нас не паступала. А сам ён нам пакуль не патрэбен», — заявіў кіраўнік МУС. Праз які час Раман Мянцюк спатрэбіцца следству, генерал Навумаў дакладна не паведаміў. Ён толькі падкрэсліў, што пакуль не будзе вынікаў тэхнічнай экспертызы таго здарэння, «прад'яўляць камусьці абвінавачванні заўчасна».

Кіраўніцтва МУС не будзе спяшацца рабіць высновы і наконт супрацоўніка Дзяржаўтаінспекцыі, якія, спрабуючы спыніць п'янага «ліхача», перагарадзілі магістраль цывільнымі аўтамабілямі з вадзіцелямі і пасажырамі. Уладзімір Навумаў лічыць, што «даішнікі» стварылі «жывую заслону» не наўмысна. «Я ведаю, што супрацоўнікі ДАІ не мелі на мэце падстаўляць людзей. Яны кіраваліся добрымі намерамі: затрымаць парушальніка, не пусціць яго ў горад. Іншая справа, яны не разлічылі, што за рулём аўтамабіля будзе такі «адмарожаны» чалавек», — заявіў кіраўнік МУС.

Міністр таксама прызнаў, што супрацоўнікі ДАІ дзейнічалі непрафесійна і ў іх была магчымасць перагарадзіць дарогу аўтамабілямі Дзяржаўтаінспекцыі. На яго думку, таксама наўрад ці мэтазгодна было б выкарыстоўваць для спынення «ліхача» зброю, альбо «вожыка» — спецыяльную прыладу з вострымі шыпамі. «Калі б мы выкарысталі «вожыка», то было б 4 трупы. Загінулі б усе, хто знаходзіўся ў «Фольксвагене». Тое ж самае было б і ў выпадку прымянення зброі»,— адзначыў міністр. Ён заявіў, што пасля таго, як будзе завершана расследаванне крымінальнай справы, кіраўніцтва МУС яшчэ вернецца да гэтага надзвычайнага здарэння. Нагадаю, што крымінальная справа супраць «даішнікаў» была ўзбуджана пракуратурай Мінскай вобласці ў сярэдзіне сакавіка. Яны падазраюцца ў парушэнні часткі 1 артыкула 424 Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвае адказнасць за злоўжыванне ўладай альбо службовымі паўнамоцтвамі.

Разам з тым Уладзімір Навумаў даў зразумець, што далейшага «разбору палётаў» сярод «даішнага начальства» не будзе. Па выніках гэтага здарэння былі вызвалены ад пасадаў асобы, адказныя за прафесійную падрыхтоўку супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі ў раёнах, строгія вымовы атрымалі галоўныя «даішнікі» краіны, сталіцы і Мінскай вобласці. «У мяне няма маральнага права яшчэ больш строга караць начальніка ДАІ Мінска, паколькі ён на гэтай пасадзе толькі 2 месяцы», — адзначыў Уладзімір Навумаў. Няма прэтэнзій у міністра і да начальніка ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны Аляксандра Мендзелева, паколькі, як падкрэсліў Уладзімір Навумаў, у той сітуацыі з галоўным беларускім «даішнікам» нікто не райўся. Увогуле, надзвычайнае здарэнне на шашы Мінск — Мікашэвічы, як падкрэсліў міністр, адзінкавы выпадак і па ім нельга меркаваць аб працы ўсёй Дзяржаўтаінспекцыі, а тым больш прымаць нейкія захады да змянення заканадаўства.

У прыватнасці, міністр не лічыць мэтазгодным ukaраняць практыку канфіскацыі транспартных сродкаў у п'яных кіроўцаў. На такіх асобаў не дзейнічае нават пагроза крымінальнага пакарання. Прайшоў ужо цэлы год, як у нашай краіне за паўторнае кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане вадзіцеляў пачалі прыцягваць да крымінальнай адказнасці. Але выпівохаў гэта не спыніла. Затое ў кіраўніцтва МУС з'явіўся новы галаўны боль: дзе перавыхоўваць такіх парушальнікаў? «Цяпер мы думаем, як адкрыць некалькі спецкамендатур для гэтай катэгорыі людзей», — заявіў Уладзімір Навумаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Двое. У цемрані ночы

Валянцінкай

...Дом яе — якраз пасярэдзінцы: метраў 300 да гіпермаркета, столькі ж — да маленькай прадуктовай крамкі. Можна, значыць, хадзіць туды, можна — сюды. З аднолькавым поспехам. Як здавалася... Прынамсі, спачатку. Потым — з'явіўся вопыт, цікавы і, на жаль, досыць сумны: у сваёй, так бы мовіць, старой, часам праверанай крамцы, як правіла, куплялася, тое, што насамрэч патрэбна, у гіпермаркеце ж — рукі (і неяк самі па сабе...) цягнулі з паліц то адно, то другое. Нешта — таму, што ранейшы кошт быў красамоўна (чымсьці чырвоным...) закрэслены, а новы ж — хоць «на тры капейкі» — ніжэйшы, нешта — вабіла прыгожай упакоўкай, нешта «хапалі» іншыя ці падсвядома «ўдувала» рэклама... Да таго ж — там проста прыемна было няспешна, «як вялікай», даставаць тавары з паліц, разглядаць і ставіць назад альбо наадварот, — у сваю цялежку, везці да кас...

Пры разліках, аднак, ад таго, прыемнага, заставалася мала, бо пустая ж, лічы, цялежка — нічога (прынамсі, такога... каштоўнага...), як быццам, няма, а грошы — вымі і аддай. Прычым не малыя... Калі яны ёсць.

Калі ж іх няма, у гіпермаркеце тым і наогул адчуваеш сябе... Ну не тое, каб жабраком на гэтым свяце жыцця, але і не чалавекам. Дакладна.

Адчуванняў гэтых Алька не любіла, таму ў гіпермаркет дарогу «забылася» — хадзіла выключна ў крамку — у сваю, маленькую, да прыбіральшчыц знаёмую...

У гіпер тады быццам чэрці панеслі!

Пахадзіла (як па лесе...), бо даўно ж не была, паглядзела, што памянялася, што цяпер там людзі бяруць. Узяла і сама чацвярцінку хлеба і пакет малака, паклала ў карзіну, не гледзячы па баках, спакойна пайшла да кас. І раптам...

Лічы пад нагамі ў яе, ля адной з вітрын ляжаў партманет... Мужчынскі... Вялікі.

Алька азірнулася... Нахілілася, падняла. Адчула цёплую мяккасць скуры, прыемны цяжар, агледзела ў адным з аддзелаў (зразумела ж, не адвыкаючы), што грошай там — не нашых, зялёных — сантыметра паўтара.

— Э-э, хто кашалёк згубіў? — спытала яшчэ раз азірнуўшыся і, мусіць, ціха? Але ж людзі пачулі: хто-кольвечы стаў прыпыняцца, глядзець на яе, на тую знаходку, азірацца на іншых пакупнікоў. Нехта пры гэтым — абмацваў кішэні. «Я» — не казаў ніхто. Тады Аля запытала гучней. Мо, нават закрычала? Голас яе ўзвіўся пад высокую столь, паляцеў да кас і...

Адтуль, да яе, напрасткі рушыў мужчына. Твар у яго быў чырвоны, мокры, позірк — вінавата шалёны, разгублены.

— Гэта — мой, — ледзь чутна вымавіў ён і працягнуў руку.

— То вазьміце,— як малога, навучыла жанчына, — і болей не губляйце.

Мужчына згодна заківаў, быццам няверачы яшчэ, што аддадуць, дрыжачай рукой узяў знаходку, прамовіў ціхае «Дзякуй» і, пад «абстрэлам» пільных позіркаў хуценька падаўся назад, да кас.

Аліна — затрымалася: «паваронела» ля паліц з каструлямі-патэльнямі, з пральнымі парашкамі, пацягнула час. Яна баялася, што мужчына той, зразумела ж, убачыўшы яе сціплыя пакупкі, яе зношаны палітончык, мог затрымацца ля выхаду, мог пачакаць, каб неяк аддзячыць. Добра, як словамі... А калі ўжо дастаў з кашалька нейкую купюрыну, калі чакае цяпер, каб зняважліва ўсунуць? Як міласціну...

Алька ўявіла, як жа, мусіць, сорамна, як жа балюча будзе ўзяць яе?!.

Але і не браць... Ён жа, мо, ад душы, ад шчырага сэрца?..

За думкамі згубіла час, агледзела толькі, што народу ў гіпермаркеце нашмат паменела: ля кас, прынамсі, пакупнікоў няма. Няма, значыць і сведак яе знаходкі...

Таму яна смела дастала свой кашалёк, выбрала адтуль апошнія папяркі, разлічылася за хлеб і малако, — як па вуголлі, пайшла да выхаду.

Аднак, ля дзвярэй яе ніхто не чакаў. І на дварэ — не затрымаў таксама.

Па вузкай, да болю знаёмай сцежачцы, па цемры яна пайшла дамоў.

...Тады, па дарозе (ды і цяпер... Асабліва, калі грошай няма...) думала і думае, колькі ж іх было ў тым вялікім мяккім, цяжкім партманеце? Тысяча долараў? Пяць? Пятнаццаць? Цікава, адкуль іх бяруць? Дзе могуць зарабляць?.. У нейкай фірме? У банку? Але ж ні на фірмача, ні на банкіра той мужчына падобны не быў (на злодзея, між іншым, таксама)... Значыць, нешта прадаў — машыну, кватэру, дачу? Альбо грошай напазычаўшы, прыехаў у Мінск, штосьці купляць?.. А мо, быў дзе ў Расіі, на шабашцы быў, і гэта заробак на ўсю брыгаду?..

Ночы няма, каб Алька не ўспамінала яго, каб не думала...

Ён (хто ведае?), мо, трымае ў памяці яе?

...Менш за ўсё ёй хацелася б, каб трымаў за дурніцу.

Валянціна ДОЎНАР.

ИНФОРМАЦИЯ

о результатах финансово-хозяйственной деятельности

ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 2, Г. ГОМЕЛЬ»

246017, г. Гомель, Красноармейская, 28
январь-декабрь 2007 года

№ п/п	Наименование показателей	Единица измерения	Значение показателя
1	Валюта баланса	млн руб.	46278
2	Чистые активы	млн руб.	33731
3	Выручка от реализации продукции (работ, услуг)	млн руб.	127447
4	Затраты на производство и сбыт реализованной продукции	млн руб.	101343
5	Балансовая прибыль	млн руб.	4831
6	Чистая прибыль	млн руб.	2792
7	Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде, всего	млн руб.	228
8	Дивиденды, начисленные на одну акцию, с учетом налогов	руб.	199,45
9	Количество акционеров, всего	лиц	1816
9.1	В том числе юридических лиц	лиц	2
10	Среднесписочная численность работающих	чел.	1266
11	Обеспеченность акции имуществом	тыс. руб.	29,51

Генеральный директор **К.К. Костенко**

Гл. бухгалтер **С.В. Зуборева**

УНП 400022426

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Наименование предмета аукциона	Комплекс зданий и сооружений подготовительно-раскройного производства и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	г. Кобрин, ул. Советская, 137/1
Продавец недвижимого имущества	РУП «Швейная фирма «Лона», г. Кобрин, ул. Ленина, 6, тел. 80164222971
Характеристика предмета аукциона	Здание подготов.-раскройного производства, 3-этажное, 1993 г.п., фундамент бетонный, стены кирпичные, ж/б плиты, кровля совмещенная, здание компрессорной 1-этажн., 1993 г.п., фундамент бетонный, перегородки кирпичные, подъездная дорога, ограждение, сети тепло-и водоснабжения, канализации, очистные сооружения, площадь зданий-5991 кв.м Земельный участок площадью 0,5986 га, срок аренды земельного участка — 55 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	1 170 765 171
Сумма задатка, руб.	117 077 000
Организатор аукциона	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63 www. brest–region.by

Аукцион состоится **29 апреля 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

— о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

— о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107 , УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическим лицом — доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

4. Индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский язык).

6. Представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства — легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводе на белорусский (русский) язык.

7. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Физическое лицо, ставшее победителем аукциона, обязано представить справку налоговых органов об источниках денежных средств при совершении сделки на сумму, превышающую 2 000 базовых величин.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: **подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести в Кобринский районный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с РУП «Швейная фирма «Лона» договор купли-продажи недвижимого имущества, с Кобринским райисполкомом — договор аренды земельного участка.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 224006, г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 28 апреля 2008 года включительно.

унп 200020538

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении повторного открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Заславле

Арендодатель — Заславский городской исполнительный комитет

Организатор аукциона — КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Целевое назначение земельного участка	Площадь земельного участка	Срок аренды земельного участка	Характеристика расположенных на участке сооружений и инженерных коммуникаций	Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка
2	г. Заславль, микрорайон 2, 641500000001002345	для строительства административно-деловых помещений	0,0562 га	50 лет	земельный участок свободен от застройки	25 915 000 руб.
3	г. Заславль, ул. Анусинская, 623650100001003219	для строительства универсального магазина	0,0498 га	20 лет	земельный участок свободен от застройки	9 800 000 руб.
6	г. Заславль, ул. Дехновка, 641500000001002340	для установки киоска с остановочным пунктом	0,0055 га	5 лет	земельный участок свободен от застройки	3 295 000 руб.

Аукцион состоится 15.04.2008 года в 15.30 по адресу: г. Заславль, ул. Великая, 1, актовый зал Заславского горисполкома. Размер задатка по каждому лоту составляет 10 % от начальной цены и перечисляется на р/с 3012020200010, Октябрьское отделение ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Аукцион проводится со следующими условиями: победитель аукциона обязан в течение 3 (трех) месяцев с момента ввода объекта в эксплуатацию зарегистрировать юридическое лицо в г. Заславле, оформить материалы предварительного согласования места размещения земельных участков для строительства инженерных коммуникаций к объекту строительства, оплатить стоимость предмета аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка и возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 1055,38 тыс. рублей (Лот 3), вызванные изъятием сельскохозяйственных земель для использования их в целях, не связанных с ведением сельского хозяйства. Договор аренды земельного участка заключается с победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 14.04.2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326. **Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

унп 690324015

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательный совет
ОАО «АСБ Беларусбанк»
10 марта 2008 года

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
_____ Гальперин А.Л.
«27» марта 2008 года

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций сорок третьего выпуска Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк», обеспеченных правом требования по кредитам, выданным на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости

1. Наименование эмитента
на белорусском языке:
полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;
сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»).
на русском языке:
полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);
сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»);

2. Банк зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 27.10.1995, регистрационный номер 56.

3. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, телефон — (017) 218 84 08, телефон / факс — (017) 222 26 26, e-mail — info@belarusbank.by.

4. Номера расчетного и валютного счетов Банка, на которые будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций
Денежные средства при проведении открытой продажи облигаций 43-го выпуска (далее по тексту — облигации) будут поступать в Банк на балансовый счет 4940, код 795.

5. Сумма зарегистрированного уставного фонда
Уставный фонд Банка составляет 1 638 787 859 000 (Один триллион шестьсот тридцать восемь миллиардов семьсот восемьдесят семь миллионов восемьсот пятьдесят девять тысяч) рублей.

6. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность Банка и сроки ее публикации
Бухгалтерская отчетность по итогам работы Банка за 2006 год опубликована 30 марта 2007 года в газете «Звязда». Указанная информация за 2007 год будет опубликована не позднее 01 апреля 2008 года в газете «Звязда».

7. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии)
С более подробной информацией и Проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в центральном аппарате Банка по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, а также в филиалах-областных (Минском) управлениях, филиалах, центрах банковских услуг Банка в течение рабочего времени.

8. Сведения об открытой продаже облигаций

8.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение
Решение о выпуске 43-го облигационного займа в соответствии с подпунктом 10.2.Устава Банка принято Наблюдательным советом Банка 10 марта 2008 года, протокол № 4.

8.2. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций:
✓ облигации выпускаются в бездокументарной форме (в виде записей на счетах);
✓ объем эмиссии — **100 000 000 000 (Сто миллиардов) белорусских рублей;**
✓ количество — 100 000 (Сто тысяч) облигаций;
✓ серия **«БО 43»**, №№ 000 001-100 000.

8.3. Номинальная стоимость облигаций — 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей.

8.4. Цель выпуска облигаций
Выпуск облигаций осуществляется в целях привлечения временно свободных денежных средств юридических лиц и физических лиц, приобретающих облигации в связи с осуществлением ими предпринимательской деятельности, (далее — индивидуальные предприниматели) и направления полученных ресурсов на рефинансирование ранее выданных кредитов на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости.

8.5. Период проведения открытой продажи облигаций
Открытая продажа облигаций проводится **с 01.04.2008 по 31.03.2009**, если больший срок не будет определен Правлением Банка.
Срок открытой продажи может быть сокращен в случае полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

8.6. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Открытая продажа облигаций осуществляется на внебиржевом рынке и/или в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Владельцами облигаций могут быть резиденты и нерезиденты Республики Беларусь в соответствии с законодательством Республики Беларусь — юридические лица и индивидуальные предприниматели.
Для приобретения облигаций юридические лица и индивидуальные предприниматели могут обращаться в филиалы-областные (Минское) управления, филиалы, центры банковских услуг и центральный аппарат Банка. Отделения Банка в продаже облигаций не участвуют.
В день начала открытой продажи **(01.04.2008)** облигации размещаются по цене, равной номинальной стоимости.
Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает накопленный купонный доход (НКД) за текущий купонный период со дня начала текущего купонного периода по день фактической продажи, рассчитываемый по следующей формуле:

НКД = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + …. + Kn*H*tn)/(365(366)*100)

где:
НКД – накопленный купонный доход;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части текущего купонного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней текущего купонного периода, истекших со дня начала текущего купонного периода;
K1, K2, Kn – процентная ставка по купону (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс 1,25 (Один целый двадцать пять сотых) процентного пункта;
H – номинальная стоимость облигации.
Расчет купонного дохода по облигациям осуществляется по каждой облигации исходя из фактического количества дней в году (365 или 366). Проценты начисляются за каждый календарный день года.
Юридические лица и индивидуальные предприниматели, изъявившие желание приобрести облигации на внебиржевом рынке, обязаны перечислить Банку денежные средства в безналичном порядке на балансовый счет 4940, код 795 в соответствии с договором продажи облигаций.
Расчеты при открытой продаже облигаций на биржевом рынке проводятся в соответствии с регламентом расчетов в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

8.7. Срок обращения облигаций
Срок обращения облигаций — **1095** календарных дней (с **01.04.2008** по **31.03.2011**).

8.8. Дата начала погашения облигаций и порядок их погашения
Дата погашения облигаций — **01.04.2011.**
При погашении владельцам выплачивается номинальная стоимость облигаций, а также выплачивается доход за последний купонный период (иные неполученные купонные доходы — при их наличии).
Погашение облигаций производится на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке причитающихся денежных средств на счета владельцев облигаций в белорусских рублях, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. Реестр владельцев облигаций формируется за **5 рабочих дней** до даты погашения облигаций.
В случае если день погашения выпадает на нерабочий день, погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене равной номинальной стоимости. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.
При погашении облигации выплата части номинала облигации и/или части купонного дохода не производится.

8.9. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты
Процентная ставка купонного дохода по облигациям – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения **плюс 1,25** (Один целый двадцать пять сотых) процентного пункта.
Выплата дохода по облигациям производится владельцам облигаций периодически (один раз **в три месяца** в соответствии с графиком выплаты купонного дохода) в виде купонного дохода на основании реестра владельцев облигаций путем перечисления в безналичном порядке суммы купонного дохода на счета владельцев облигаций в белорусских рублях, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. Реестр владельцев облигаций формируется **за 5 рабочих дней** до дня выплаты купонного дохода за соответствующий купонный период.
В случае отсутствия в реестре владельцев облигаций данных о счетах владельцев облигаций в белорусских рублях, открытых в уполномоченных банках Республики Беларусь, а также в случае, если реестр содержит ошибочные банковские реквизиты, сумма, подлежащая выплате, выплачивается путем депонирования на счете Банка до непосредственного обращения владельца облигации. Проценты по депонированным суммам не начисляются и не выплачиваются.

График выплаты купонного дохода по облигациям

Номер купона (процентного периода)	Начало периода	Конец периода	Продолжительность периода, дней	Дата выплаты дохода
1	01.04.2008	30.06.2008	91	01.07.2008
2	01.07.2008	30.09.2008	92	01.10.2008
3	01.10.2008	31.12.2008	92	01.01.2009
4	01.01.2009	31.03.2009	90	01.04.2009
5	01.04.2009	30.06.2009	91	01.07.2009
6	01.07.2009	30.09.2009	92	01.10.2009
7	01.10.2009	31.12.2009	92	01.01.2010
8	01.01.2010	31.03.2010	90	01.04.2010
9	01.04.2010	30.06.2010	91	01.07.2010
10	01.07.2010	30.09.2010	92	01.10.2010
11	01.10.2010	31.12.2010	92	01.01.2011
12	01.01.2011	31.03.2011	90	01.04.2011

В случае если дата выплаты купонного дохода выпадает на нерабочий день, выплата купонного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму купонного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочим днем в настоящем документе считается нерабочий день центрального аппарата Банка.
Первый купонный доход по облигации начисляется со дня начала купонного периода, в котором было произведено первичное размещение данной облигации, по день его истечения включительно (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем).
Второй и последующие купонные доходы (включая последний) по облигации начисляются со дня начала очередного купонного периода по день истечения данного купонного периода включительно (в том числе, если указанный день истечения является нерабочим днем). День окончания последнего купонного периода по облигациям — **31.03.2011.**
Расчет купонного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за купонный период, определенный в соответствии с вышеуказанными правилами, по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь с учетом ее изменения **плюс 1,25** (Один целый двадцать пять сотых) процентного пункта.
Купонный доход рассчитывается по следующей формуле:

Д = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + …. + Kn*H*tn)/(365(366)*100)

где:
Д – купонный доход;
t1, t2, tn – количество дней соответствующей части купонного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней в соответствующем купонном периоде;
K1, K2, Kn – процентная ставка по купону (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной, равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс **1,25** (Один целый двадцать пять сотых) процентного пункта;
H – номинальная стоимость облигации.
Расчет купонного дохода по облигациям осуществляется по каждой облигации исходя из фактического количества дней в году (365 или 366). Проценты начисляются за каждый календарный день года.
Выплата части купонного дохода не производится.

8.10. Условия и порядок досрочного погашения облигаций
Банк осуществляет досрочный выкуп облигаций в порядке, определенном п. 8.14 настоящего документа.
В случае выкупа всего объема эмиссии облигаций данного выпуска, Банк может принять решение о его досрочном погашении.

8.11. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
В случае запрета Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций Банк в срок **не позднее 30 дней** с момента принятия указанного решения возвращает владельцам облигаций денежные средства, направленные на покупку облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь **плюс 1,25** (Один целый двадцать пять сотых) процентного пункта.

8.12. Дата и номер регистрации облигаций в регистрирующем органе
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь «27» марта 2008 года.
Регистрационный номер выпуска: 5-200-02-0127

8.13. Информация об обеспечении облигаций
Облигации обеспечены правом требования по кредитам, выданным Банком физическим лицам на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости, включенными (включаемыми) в соответствующий сформированный реестр данных обязательств, ведение которого Банк осуществляет в порядке, определенном законодательством Республики Беларусь.
Основная сумма долга по включенным в реестр обязательствам по кредитам, выданным банком на строительство, реконструкцию или приобретение жилья под залог недвижимости, служащих обеспечением облигаций, по состоянию на 10 марта 2008 года составляет **150 152 802 633** (Сто пятьдесят миллиардов сто пятьдесят два миллиона восемьсот две тысячи шестьсот тридцать три) белорусских рубля.
Банк ведет реестр обязательств по кредитным договорам, служащих обеспечением облигаций, и обеспечивает установленный в части второй подпункта 1.1. пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.08.2006 № 537 «О выпуске облигаций банками» норматив соответствия объема находящихся в обращении облигаций размеру основной суммы долга обязательств по кредитным договорам.

8.14. Порядок досрочного выкупа облигаций в период их обращения
В период обращения облигаций Банк обязуется осуществлять досрочный выкуп облигаций у любого их владельца одновременно с выплатой начисленного дохода за истекшие соответственно первый, второй, третий, четвертый, пятый, шестой, седьмой, восьмой и десятый купонные периоды в следующие даты: **01.07.2008, 01.10.2008, 01.01.2009, 01.04.2009, 01.07.2009, 01.10.2009, 01.01.2010, 01.04.2010, 01.10.2010.**
Выкуп облигаций осуществляется по цене, равной номинальной стоимости облигации. Выкуп облигаций осуществляется Банком в соответствии с правилами Секции фондового рынка ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».
В случае если день досрочного выкупа выпадает на нерабочий день, досрочный выкуп осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем, по цене, равной номинальной стоимости. Проценты на сумму досрочного выкупа за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
Для осуществления досрочного выкупа владельцы облигаций – юридические лица и индивидуальные предприниматели должны подать в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
— наименование владельца облигаций;
— наименование ценной бумаги;
— количество облигаций, предложенных к досрочному выкупу;
— наименование профессионального участника рынка ценных бумаг, который будет осуществлять продажу облигаций в ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа»;
— согласие с условиями досрочного выкупа, которые изложены в зарегистрированном Проспекте эмиссии облигаций;
— юридический адрес и контактные телефоны заявителя;
— подпись уполномоченного лица.
В случае если для осуществления досрочного выкупа владельцу облигаций необходимо принятие решения соответствующего органа, или получение согласования, или получение разрешения, владелец выкупаемых облигаций обязан заблаговременно принять (получить) данное решение (согласование, разрешение).
Заявление о досрочном выкупе должно быть представлено в Банк в следующие сроки

Купонный период, после которого осуществляется досрочный выкуп	День досрочного выкупа	Срок предоставления заявления о досрочном выкупе
1	01.07.2008	не позднее 23.06.2008
2	01.10.2008	не позднее 23.09.2008
3	01.01.2009	не позднее 23.12.2008
4	01.04.2009	не позднее 24.03.2009
5	01.07.2009	не позднее 23.06.2009
6	01.10.2009	не позднее 23.09.2009
7	01.01.2010	не позднее 23.12.2009
8	01.04.2010	не позднее 24.03.2010
10	01.10.2010	не позднее 23.09.2010

Заявление передается в Банк по факсу (с последующим предоставлением оригинала не позднее трех дней до дня соответствующего досрочного выкупа), заказным письмом или непосредственно по адресу: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, тел. 218 84 08, факс 222 26 26. **Заявление, предоставленное после указанных дат, к исполнению не принимается.**
Банк имеет право осуществлять:
— выкуп облигаций на биржевом рынке в иные сроки по цене, определяемой Банком;
— дальнейшую реализацию выкупленных облигаций;
— иные действия с выкупленными облигациями в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Председатель Правления
ОАО «АСБ Беларусбанк» **Н.А. ЕРМАКОВА**

Главный бухгалтер
ОАО «АСБ Беларусбанк» **И.П. ЛЫСОКОВСКАЯ**

http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Казкі для дарослых

ШМАТХАДОЎКА, або З днём нараджэння, дарагая!

Гэта было цудоўнае футрачка з серабрыстай норкі. Шаўкавістыя спінкі звяркоў пераліваліся на святле разнастайнымі адценнямі шэрага і блакітнага.

— Ну што скажаш? — пытанне было хутчэй рытарычным, таму што мела на ўвазе дакладны адказ. Лара зарылася ў пухнаты каўнерык і адтуль дапытліва пазірала на мяне ў чаканні вышэйшай адзнакі.

— Супер, проста супер! — я асцярожна выпісвала вакол яе кругі, баючыся дакрануцца да гэтага цуду. Футрачка ахутвала Лару, як аблачынка. Здавалася, яно нічога не важыць. Мне, як асобе «набліжанай», заставалася задаць толькі адно пытанне, якое і без таго віселa ў паветры. Не спытаць я не магла, бо проста лопалася ад цікаўнасці.

— Адкуль?!

— Адтуль! — Лара тэатральна закацiла свае прыгожыя вочкі і паказала пальчыкам некуды ўверх. Мне ўсё стала зразумела. «Адтуль» магло азначаць толькі адно: футрачка дастаўлена «пад заказ» Ларыным даўнейшым паклоннікам і блізкім (бліжэй няма куды) сябрам Міхаілам Аркадзьевічам з суму, што ты прызначыла! Наіўны Паша і не здагадваецца, які падарунак зробіць сёння жонцы. Я пакуль што толькі намякнула яму, што бачыла ў камісіёнцы недарагое, але вельмі прыстойнае футрачка... Дарэчы, не забудзь потым зайсці туды і забраць грошы. І не спяшайся мне іх вяртаць — купі сабе што-небудзь прыемнае... Ну, да сустрэчы. Патэлефаную вечарам.

Вечарам яна не патэлефанавала. Не патэлефанавала і на наступны дзень, і праз дзень... Мне, уласна кажучы, таксама было не да Лары з яе выкрутасамі. Затое пазванілі з магазіна і папрасілі забраць грошы за прададзенае футрачка (трыста у.е. мінус камісійны збор), што прымусіла мяне яшчэ раз пераканацца ў Ларынай геніяльнасці...

Сама яна з'явілася на парозе маёй кватэры праз тыдзень — у сваім звычайным турэцкім «пухавіку». Скінула боты, прайшла на кухню і змрочна папрасіла кавы.

— А дзе тваё... — пачала я і асеклася: па Ларыным твары беглі ручаі, змываючы рэшткі касметыкі.

— Дзе-дзе, у Карагандзе, — усхліпнула яна і палезла ў сумачку

апошняй замежнай камандзіроўкі. Ёй і раней ад яго сёе-тое перападала: пярсцёнак там, завушнічкі, бранзалецік... Лара складзiравала ўсё гэта дабро ў скрыначку з разнастайнай біжутэрыяй, і яе муж ніколі не цікавіўся, што яна там захоўвае.

Але футрачка!.. Футрачка — гэта была зусім іншая справа. Яго нельга было схаваць у скрынку, каб потым з нявінным выглядам выцягнуць, апрануць, махнуць абыякава рукой і сказаць: «А, драбяза... Ты яго ўжо бачыў». І Лара цудоўна гэта разумела.

Таму яна пяшчотна, але настойліва ўзяла мяне за перламутравы гузік, прыцягнула да сябе і загаворніцкім паўшэптам (хоць у кватэры больш нікога не было) спытала:

— Ты мне дапаможаш?!

Гэта было нават не пытанне, гэта быў крык душы, і Лары вельмі хацелася, каб я яго пачула. А яшчэ больш ёй хацелася хутчэй апрануць абноўку...

— Заўтра з раніцы я прывязу футра да цябе на работу. Ты возьмеш яго, аднясеш у камісіёнку і афоршмаш на сваё прозвішча па самай мінімальнай цане...

Лара на хвіліну задумалася...

— Долараў за пяцьсот. Не, лепш за трыста. І неадкладна, запомні, неадкладна мне патэлефануеш. Я адразу ж заеду да Пашы на работу і зацягну яго ў магазін. І няхай толькі паспрабуе адмовіць мне ў падарунку да дня нараджэння!

— Але ж твой дзень нараджэння праз тры месяцы, — асцярожна нагадала я ёй.

— Ну і што?! — легкадумна паціснула плечыкамі Лара. — Падарунак можна зрабіць і раней.

Ёй увогуле многае сходзіла з рук. Два гады таму Міхаіл Аркадзьевіч узяў Лару з сабой у Маскву ў дзелавую камандзіроўку. Дзелавой паездка была, безумоўна, для яго. Ларыса ж падрабязна вывучала асартымент гандлёвых пунктаў... Але галоўнае не гэта. Мужу яна паведаміла, што ў Маскву едзе са мной, а я быццам бы адпраўляюся да нейкіх там сваякоў. Прычым выязджаю на суткі раней за яе (сказана было на той выпадак, калі б муж пажадаў пасадзіць Лару ў цягнік, дзе мая адсутнасць аказалася б відавочнай). У дадатак да гэтага мне трэба было патэлефанаваць яму на работу «з Масквы» і ўдакладніць месца, дзе я збіраюся «сустрэць» яго «благаверную». А потым яшчэ цэлы тыдзень перасоўвацца па родным горадзе «кароткімі перабежкамі», уціснуўшы галаву ў каўнер, каб не дай Бог не перасекчыся з Пашам у якім-небудзь трывіяльным гастраноме...

Назаўтра, як і патрабавалася па «сцэнарыі», я пазваніла Лары з камісійнага магазіна:

— Усё ў парадку, твой «тавар» красуецца на плечыках у гандлёвай зале, можаце прыязджаць! Кошт — 300 у.е. Праўда, тавараznаўца паглядзела на мяне як на скончаную ідыётку — напэўна, падумала, што мне тэрмінова патрэбны грошы.

Ларка задаволена хіхікнула ў трубку:

— Яшчэ б!.. Ды гэта рэч каштуе разоў у дзесяць больш за тую

па насоўку. — Ведаеш, спачатку ўсё ішло па плану. Прыехалі ў магазін, я прымерала футра... Паўліку яно так спадабалася, усё круцiўся вакол мяне, прыцмокваў... Натуральна, папрасіў адвесіць яго на гадзіну. Потым падкінуў мяне на работу, а сам паехаў дадому па грошы... І знік! Тэлефаную на мабільны — не адказвае, набіраю нумар кабінета — доўгія гудкі. Я ледзь не звар'яцела — усялякага надумалася. І тут ён з'яўляецца — вясёлы, са скруткам падпахай. Я ліханамкава разгортваю паперу, а там... дублёнка з камісіёнкі, ды яшчэ не першай «свежасці», напэўна, праз тры хімчысткі прайшла! «Футрачка тваё, — кажа муж, — нехта купіў, не паспеў я, на дарогах суцэльныя заторы былі. Але ж і гэта рэч не горшая, і каштуе нядорага, столькі ж, і памер твой. Так што з днём нараджэння, дарагая!».

Лара ўткнулася галавой у стол, яе худзенькія плечыкі затрэсліся ад рыданняў.

— Лар, ну, Ла-а-ра... Ну што ты так перажываеш?.. Ды Бог з ім, з футрам, як прыйшло, так і пайшло. Міхаіл Аркадзьевіч табе яшчэ адно прывязе, — спрабавала я суцешыць яе.

Лара раптам перастала рыдаць і ўзняла галаву.

— Ведаеш, а я яго бачыла.

— Каго, Міхаіла Аркадзьевіча?

— Ды не, сваё футра. Заехала ўчора да Пашы на работу, а ён некуды выйшаў. Села ў прыёмнай пачакаць. І тут заходзіць яго сакратарка, а на ёй — тая самая норка.

— Слухай, а ты нічога не блытаеш? Урэшце, бываюць і супадзенні...

Лара паглядзела на мяне вачыма, поўнымі слёз:

— І многа ты бачыла сакратарак у футрах з серабрыстай норкі?

Шчыра кажучы, я не знайшла што ёй адказаць.

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

100-ДОЛАРАВЫЯ ФАЛЬШЫЎКІ

Злачынны «квартэт», праз рукі ўдзельнікаў якога прайшоў не адзін дзесятак доларавых падробак, затрыманы праваахоўнікамі.

Паводле папярэдняй інфармацыі, у Мінску супрацоўнікі міліцыі ўзялі за незаконнае абарачэнне наркотыкаў двух мужчын — 20 і 27 гадоў, якія адбываюць пакаранне ў папраўчай установе адкрытага тыпу. А ў Брэсце праваахоўнікі затрымалі яшчэ адзін «дуэт» — непрацуючых 28 і 26 гадоў, адзін з якіх раней быў неаднаразова судзімы. Як мяркуецца, гэтыя затрыманыя 2 і 3 сакавіка збылі ў беларускай сталіцы 23 фальшывыя купюры па 100 долараў кожная. Адкуль у прайдзісветаў з'явіліся падробкі? Хто пацярпеў у выніку іх дзеянняў? — адказ на гэтыя і іншыя пытанні дасць следства.

Ігар ГРЫШЫН.

Краіна здароўя

Выпуск № 17 (73)

Доктар адкажа

ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

На будучым тыдні дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

31 сакавіка — галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Валерый Віктаравіч ГРЫНЬ.

1 красавіка — галоўны ўрач 2-й сталічнай дзіцячай паліклінікі Наталля Барысаўна КОЗІЧ.

У графіку магчымыя змяненні.

Інфарм-укол

Халестэрын — ні пры чым?

У 1970-я гады высветлілася, што самая нізкая ў Еўропе частата сардэчна-сасудзістых захворванняў — у Францыі, дзе ўзровень спажывання жывёльных тлушчаў адзін з самых высокіх. «Французскі парадокс» быў растлумачаны досыць проста: маўляў, французы ўжываюць яшчэ і шмат чырвонага віна, якое ўтрымлівае поліфенолы, здольныя перашкаджаць асяданню халестэрыну на сценках сасудаў. Але тут высветлілася, што ў датчан, якія віна п'юць мала і аб'ядаюцца сметанковым маслам, частата атэрасклерозу таксама ніжэй за сярэднееўрапейскую.

Некаторыя даследаванні, праведзеныя ў розных краінах, не выявілі прамой сувязі паміж колькасцю халестэрыну, які паступае з ежай, і яго канцэнтрацыяй у крыві. Не сакрэт, што дзве трэці вышэйпамянёнага рэчыва арганізм сінтэзуе сам. Прычым, як мяркуецца, калі ў ежы шмат халестэрыну, то яго сінтэз у арганізме зніжаецца, калі мала — павышаецца. Разам з тым урачы заўважылі, што атэрасклероз часта развіваецца на фоне нармальнага халестэрыну ў крыві. Адначасова было ўстаноўлена, што справа не ў абсалютнай колькасці халестэрыну ў крыві, а ў тыпе ліпапратэідных капсул, у якія ён «запакаваны». Атэрасклероз выклікаецца «дрэнным» халестэрынам, які ўваходзіць у склад ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці. «Добры» халестэрын, які ўтрымліваецца ў капсулах ліпапратэідаў высокай шчыльнасці, не толькі не небяспечны, але нават кампенсуе дзеянне ліпапратэідаў нізкай шчыльнасці. Сцвярджаецца, што і першыя, і другія не маюць адносінаў да халестэрыну, атрыманага з ежай. Гэта — транспартныя формы халестэрыну, які сінтэзуецца самім арганізмам.

Зноў жа, варта нагадаць, што ў халестэрыну ёсць свае абавязкі ў арганізме. Гэта рэчыва складае, скажам, аснову клетачных мембран, прычым уплывае не толькі на іх механічныя вартасці, але і на пранікальнасць, на актыўнасць мембранных ферментаў і рэцэптараў да сігнальных рэчываў. Напрыклад, ад колькасці халестэрыну ў мембране залежыць эфектыўнасць работы сератанінавых рэцэптараў. А сератанін, як вядома, шырока выкарыстоўваецца ў сістэме рэгуляцыі эмацыянальнага тонусу. Адсюль і даныя аб тым, што людзі з заніжаным узроўнем халестэрыну часцей за іншых трапляюць у аварыі, ідуць на самагубства, становяцца ахвярамі насілля. Каля 20 працэнтаў усяго халестэрыну ў арганізме ўтрымліваецца ў галаўным і спінным мозгу, дзе ён увахо-дзіць у склад спецыфічнай «ізаляцыі» нерваў. Такім чынам, асноўнае прызначэнне той часткі халестэрыну, якая не ідзе на сінтэз іншых рэчываў, — абарончa-ізаляцыйнае.

У такім выпадку асяданне багатых на халестэрын пеністых клетак на пэўных участках сасудаў наводзіць на думку, што гэта не першапрычына паталагічнага працэсу, а абарончая рэакцыя арганізма. Паводле адной тэорыі, усё пачынаецца з пашкоджання сценкі сасуда, дакладней, яе ўнутранай высцілкі — эндатэлію. Прычынамі гэтага пашкоджання могуць быць інфекцыі, лішак інсуліну, аўтаімунная атака і інш. Пад асабліва падазрэнне трапіў прамежкавы прадукт абмену адной амінакіслаты. У норме ён жыве нядоўга, але часам (напрыклад, пры дэфіцыце фолievай кіслаты) не спяшаецца з далейшым ператварэннем, і тады праяўляецца яго непрыемная вартасць — таксічнасць для клетак эндатэлію.

Можна меркаваць, што пашкоджаны эндатэлій пачынае клікаць на дапамогу, вылучаючы пры гэтым спецыяльныя сігнальныя рэчывы. Асобныя клеткі крыві рэагуюць на гэта і, па ідэі, пачынаюць працаваць над стварэннем пашкоджаных ўчастак працягвае перараджацца, а халестэрынавая бляшка расце і расце... Не вядома, што становіцца прычынай паталагізацыі працэсу, але можна думаць, што праблема тут заключаецца не ў канкрэтным халестэрыне, а ў разладзе сістэмы рэгулявання пэўных узаемадзеянняў.

Дарэчы, хранічны стрэс таксама можа выклікаць такі непарадак у арганізме, што, хутчэй за ўсё, адбылося, скажам, з амерыканскімі салдатамі, якія загінулі ў Карэі. Ваенныя ўрачы таго часу выявілі ў здаровых маладых хлопцаў буйныя халестэрынавыя бляшкі ў каранарных артэрыях.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

На заметку

Ідэальным утрыманнем халестэрыну ў крыві лічыцца 3—6,5 ммоль/л. Але біяхімічныя паказчыкі ў розных людзей вельмі моцна адрозніваюцца, таму не заўсёды трэба трывожыцца тым, у каго выяўляюцца больш высокія лічбы. Дрэнна, калі канцэнтрацыя халестэрыну ў крыві дакладна расце ў параўнанні з першай вялічынёй. Гэта сведчыць аб сур'ёзных непаладках у рэгуляцыі абмену тлушчаў. У любым выпадку варта, вядома ж, пракансультавацца ў эндакрынолага.

Амбулаторыя на сонечных батарэях

За апошнія некалькі гадоў на Міншчыне праведзены рамонт 60 вясковых медыцынскіх устаноў. Сёлета пачне працаваць незвычайная ўрачэбная амбулаторыя ў пасёлку Лань Нясвіжскага раёна. Будынак, які ўзвядуць з выкарыстаннем энергазберагальных матэрыялаў, абсталююць сонечнымі батарэямі. Таксама мяркуецца здаць у эксплуатацыю інфекцыйны корпус Жодзінскай гарадской бальніцы. За кошт сродкаў абласнога бюджэту закуплена больш чым 200 санітарных аўтамабіляў. На Міншчыне правядуць рэканструкцыю і перааснашчэнне дзіцячых бальніц. А на працягу бліжэйшых трох гадоў такія работы адбудуцца ў цэнтральных раённых і ў бальніцах хуткай дапамогі, перынатальных цэнтрах.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

«Славянка» кінула курыць

Праўда, пакуль толькі ў працоўны час. Паводле загада кіраўніцтва бабруйскага швачнага прадпрыемства ААТ «Славянка», работнікі маюць права курыць толькі ў абедзены перапынак ва ўстаноўленым месцы. Тут працуе 1600 чалавек, і 90 працэнтаў — гэта жанчыны. Паводле апытанняў, у асобных падраздзяленнях курыць цыгарэты да паловы работнік. Асабліва шмат курыць маладыя дзяўчаты, якія прыходзяць на прадпрыемства пасля заканчэння навучальных устаноў.

За выкананнем загада сочаць кіраўнікі і грамадскія інспектары.

— Яны складаюць пратаколы аб парушэннях, — паведаміў намеснік дырэктара па ідэалагічнай працы і кадрах Мікалай Плаксіцкі. — Выклікаем на камісію, жанчыны чырванеюць і бялеюць, абяцаюць кінуць курыць. Многія выконваюць свае абяцанні. Напрыклад, у адной з маладзёжных брыгад кінулі курыць 5 жанчын. Працэс пайшоў!

Ілона ІВАНОВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Банк недалічыўся вялікай сумы грошай — каля 30 тысяч долараў. Высветлілася, што адзін з яго супрацоўнікаў браў грошы і прайграваў іх у казіно. Гісторыя зусім не з дзікага Захаду. Яна здарылася не так даўно ў Гомелі і нарабіла шуму. Пра што чалавек думаў?..

Мы аднойчы разважалі на гэтую тэму ў артыкуле «Карты, грошы, тры сталы» (ліпень 2005 г.), імкнучыся зразумець, чым маніць людзей таямнічы свет казіно. Не было ў тым матэрыяле толькі погляду спецыялістаў на тое, як пазбавіцца ад чараў гэтай таямнічасці. Ды і ўзнікаюць новыя аспекты гэтай тэмы ў сувязі з тым, што мяняюцца ўмовы існавання гульнявых устаноў у Расіі: беларускія казіно могуць прыкідваць, наколькі падымуцца іх даходы за кошт прытоку гульцоў-суседзяў і, напэўна, гэта не так дрэнна для эканомікі краіны... Але як паглядзець: казіно — гэта такая з'ява, з якой ніколі не ведаеш, дзе ты знайшоў, а дзе страціў.

СТАВАК БОЛЬШ НЯМА

АЗАРТНЫЯ ЛЮДЗІ

Некаторыя лічаць, што гулец — гэта абмежаваны чалавек, які шукае лёгкіх грошай. Псіхолагі сцвярджаюць, што гэта далёка не так. Як правіла, гэта людзі энергічныя, шмат у чым таленавітыя, якія спазналі поспех і якія імкнуцца да яго. Шмат хто з іх зрабіў выдатную кар'еру, з'яўляецца аматарам спорту. Яны не баяцца рызыкі ў справах.

Гуляць гэтыя людзі ідуць не дзеля заробку, а дзеля адпачынку, забавы, разняволення. Вабіць лёгкі шлях атрымаць задавальненне ў часе рызыкоўнай і эмацыйнай гульні. Аднак амаль ніхто з іх не задумваецца, што кошт можа быць вялікі — не столькі нават прайграныя грошы, колькі псіхічнае здароў'е, а часам і жыццё.

Спецыялісты пачынаюць біць у званы. У Беларусі хуткімі тэмпамі расце колькасць людзей, якія церпяць ад гульнявой залежнасці. Для азартных людзей у Мінску адчынены спецыялізаваны цэнтр рэабілітацыі пры Рэспубліканскім наркалагічным дыспансэры. Пакуль гульняманы, якія звярнуліся па спецыялізаваную дапамогу, складаюць у Беларусі 1 працэнт ад усіх залежных. Аднак праблема ў тым, што па прафесійную дапамогу часцей звяртаюцца людзі, у якіх гэтая залежнасць існуе разам з хімічнай — ад наркотыкаў ці алкаголю.

— Звычайны гулец не лічыць сябе залежным. Калі ж да справы далучаюцца наркотыкі ці алкаголь, то ў крайнім выпадку чалавек звяртаецца па дапамогу. Большасць алкаголікаў ці наркаманаў сцвярджаюць, што ў іх існуе схільнасць да іншых залежнасцяў. І навокал ствараюцца ўмовы, каб гэтая залежнасць пашыралася — адкрываюцца новыя казіно, залы гульнявых аўтаматаў, — сцвярджае кіраўнік наркалагічнага аддзялення Рэспубліканскага наркадыспансэра Вячаслаў Цыруль.

У Беларусі працуюць больш за 60 казіно. За апошнія гады 22 гульнявыя ўстановы з-за розных парушэнняў былі пазбаўленыя ліцэнзіі і закрыліся. Але медыкі сцвярджаюць, што патэнцыйнымі ахвярамі гульняманіі ў Беларусі могуць стаць ад 5 да 10 працэнтаў насельніцтва.

...Для Аляксандра больш за 20 гадоў жыццё — гэта гульня. Спачатку карты, латарэі, потым рулетка і аўтаматы. Заможны бізнэсмен заклаў у казіно кватэру і два аўтамабілі. Пачаў піць. Жонка падала на развод.

— Усё неяк хутка пачало адбывацца ў апошнія гады. Я практычна стаў перад выбарам: альбо з дзесятага паверха ўніз, альбо... не ведаў што рабіць, — гаварыў Аляксандр, які быў вымушаны звярнуцца ў дыспансэр па дапамогу.

Псіхолаг рэабілітацыйнай праграмы дыспансэра Святлана Будзіс-Міткіна тлумачыць, што гульня засмоктвае хутка, часам за некалькі тыдняў. Варта чалавеку пачаць выйгрываць, як яму падаецца, што поспех і фартуна будуць спадарожнічаць яму заўсёды.

— На гульню яны пачынаюць выдаткоўваць усё больш сілаў і хацелі б за гэта атрымліваць узнагароду ў выглядзе прыза. Аднак перамога тут толькі верагодная, а паражэнне, як правіла, гарантаванае. Пройгрыш правакуе пачуццё віны і злосці, а таксама жаданне любым чынам дасягнуць жаданага поспеху, — тлумачыць псіхолаг механізм азарту.

Натуральна, што не ўсе становяцца паталагічнымі гульцамі. Хтосьці гуляе з адносна халоднай галавой. Гэтыя людзі самадастаковыя і маюць надзвычай высокі ўзровень самакантролю. За гульнёй яны праводзяць не шмат часу, не робяць вялікіх ставак, гуляюць на вызначаную суму і імкнуцца не пераступіць парог дазволенага, не перавысіць суму, якую гатовыя страціць. Яны гуляюць выключна дзеля адпачынку, не праследуюць грашовых мэтаў, умеюць стрымана рэагаваць на выйгрыш. Для іх гульня — толькі «прыкольны» эпізод у жыцці.

Пра такіх загартаваных людзей любяць распавядаць уласнікі казіно. Яны лічаць праблему надуманай і несур'ёзнай. Аднак «загартаваных» людзей мала. Большасць людзей, падсеўшы на гульню, пачынаюць паводзіць сябе ўсё больш і больш актыўна, робяць усё больш высокія стаўкі. Незаўважна для сябе яны пачынаюць пагружацца ў так званы гульнявы транс: забываюць пра тое, чаму збіраліся гуляць — выйграць, альбо вярнуць згубленае. Калі ж яны перамагаюць, то не ведаюць, што рабіць з набытымі фішкамі ці грашыма, і зноў робяць стаўкі, працягваючы гуляць да моманту, калі ў кішэні ўжо нічога не застаецца. Трансавы стан суправаджаецца выкідам гіганцкай колькасці нейрагармонаў, што забяспечвае выхад моцных эмоцый.

— Гульнявы транс — гэта псіхічны стан, які можна параўнаць з эфектам ад моцных псіхаактыўных рэчываў, якімі з'яўляюцца наркотыкі. Прага гэтых адчуванняў настолькі моцная, што чалавек паступова губляе цікавасць да рэальнага жыцця. Доза звышэмоцый тым вышэйшая, чым вышэйшая стаўка. Менавіта гэты паталагічны стан прыводзіць чалавека да катастрафічнага разарэння, а не банальная сквапнасць. Залежнасць гэтая ўзнікае хутчэй, чым наркатычная, але пазбавіцца ад яе больш цяжка, — сцвярджае ўрач-псіхатэрапеўт цэнтра «ТЭС-тэрапія» Валерый Грынь. Паводле назіранняў спецыяліста, людзі, якія разам з гульнёй не супраць расслабіцца з дапамогай чаркі і іншага, хутчэй ператвараюцца ў цяжкіх гульняманаў, і ім пазбавіцца ад гэтай залежнасці значна цяжэй. Здаецца, гульнявыя ўстановы самі правакуюць гэта: у казіно, як правіла, на месцы можна «замачыць» радасць нечаканага выйгрышу ці «заліць» горыч няўдачы. Эфект адчуванцца: за некалькі месяцаў гэтага года ў цэнтр «ТЭС-тэрапія» звярнулася ўжо некалькі дзесяткаў чалавек.

ФАТАЛЬНЫЯ ЗАБАВЫ

Як правіла, людзі, якія разумеюць, што «папаліся», шукаюць дапамогі ў прыватных спецыялістаў. З-за гэтага немагчыма ацаніць у поўнай меры ўплыў гульняманіі на жыхароў Беларусі. Але гульнявая залежнасць усё часцей уключаецца ў спіс паслуг, якія аказваюць ці прафесійныя псіхатэрапеўты, ці нават сумніўныя магі. Апошняе — рызыкоўна, асабліва таму, што гульнявая залежнасць — не фантазія маралістаў. Сусветная арганізацыя аховы здароў'я прызнала залежнасць ад гульні псіхічным захворваннем, надаўшы яму міжнародны код F63.0. Паводле даных арганізацыі, ад гэтага пакутуюць каля 10 працэнтаў насельніцтва свету. У маленькай Эстоніі на азартную залежнасць пакутуюць 25. 000, у Германіі —100 000, у Фінляндыі — 130 000. У Італіі —150 000, у ЗША — каля 5 мільёнаў чалавек.

Існуе меркаванне, што ёсць нацыі, у якіх азарт ледзь не ў крыві, а ёсць тыя, якія ўмеюць кантраляваць гэтую рысу. Чалавек з «гарачым» тэмпераментам мае шанцы стаць больш зацятым гульцом з самымі драматычнымі для сябе наступствамі. А якія беларусы? Спакойныя і ўраўнаважаныя, не прыыклі шукаць шалёных грошай, імкнуцца сумленнай працай зарабіць капейчыну, таму пяць разоў падумаюць пра тое, куды і навошта яе аддаюць. І можна было б супакоіцца, што фатальнай для нацыі гэтая навала не стане. Але спецыялісты сцвярджаюць, што няма залежных ці ўстойлівых нацый, хвароба ўніверсальная. Апошнія даследаванні паказалі, што ў галаўным мозгу любога чалавека ёсць цэнтр, які адказвае за азарт... Лепш не будзіць звера.

БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ:

калі ўсё часцей блізкі чалавек стаў шмат на чым эканоміць, дакладна кантралюе набыткі, хавае сапраўдныя памеры заробку і на словах павялічвае выдаткі, прыдумляе розныя версіі знікнення сродкаў, скарыстоўвае розныя нагоды, каб узяць пазыку ў сяброў, сваякоў і нават у банку.

Пазбаўленне ад залежнасці зойме часу ўдвая больш, чым той, за які яна сфармавалася, сцвярджае псіхолаг Святлана Будзіс-Мінкіна. За 5 патрачаных на гульню гадоў, на выздараўленне пойдуць усе 10. Жыхары Беларусі звяртаюцца па прафесійную дапамогу толькі ў самых-самых крайніх выпадках, у той час як у заходніх краінах лічаць за лепшае спыніць залежнасць на першых стадыях. У Беларусі большасць звароташ не ад саміх гульцоў, а ад іх сваякоў — маці, жонак, дзяцей, якія таксама церпяць і матэрыяльна, і маральна.

Пазбаўленне ад залежнасці — толькі шторшок да вызвалення. Да гэтага працэсу далучаюцца сваякі, сябры. Аднак на практыцы не ўсе гатовыя цярпець выхады свайго гульца. І тады яго падзенне становіцца больш хуткім.

Напэўна, таму, што ўсё тут так непрадказальна, святары раяць падключаць у такіх справах духоўную рэабілітацыю. Прадстаўнікі праваслаўнай царквы даўно выказваюць сваю занепакоенасць маштабамі гульняманні і па-свойму змагаюцца за душы залежных людзей.

— Не бывае бясшкодных гульняў. Сам факт таго, што чалавек імкнецца сысці ад рэальнасці, ужо павінен насцярожваць: ёсць нейкая пустэча ў яго душы. Значыць, д'ябальскім сілам будзе прасцей заняць гэтае месца. Пры гульні на аўтамаце, напрыклад, адбываецца фатальны захоп чалавечай асобы. Казіно — гэта інтэлектуальная, вытанчаная пастка. Пэўны кантынент гуляе пастаянна, ёсць тыя, хто ходзіць больш-менш рэгулярна. Такія людзі ведаюць, што знаходзяцца пад дэпрэсіі. Але асабліва трывожыць тое, што расце колькасць людзей, якія прыходзяць з-за гульні да самагубства. Наша задача — дапамагчы гульцам знайсці сэнс жыцця, каб яны зразумелі дасцыпны д'ябальскі механізм падману і ашуканства.

Гульня ідзе насамрэч на чалавечае жыццё, — сцвярджае кіраўнік місіянерскага аддзела душаапякунскага цэнтра Рускай праваслаўнай царквы, псіхолаг Ізяслаў Адліванкін.

Сярод тых, хто трапляў пад увагу царкоўных ратаўнікоў, былі людзі з Беларусі. Працаваць аднолькава цяжка з усімі, незалежна ад таго, адкуль чалавек прыехаў, якога ён узросту і сацыяльнага статусу. Нейкі час паталагічна азартныя гульцы могуць не гуляць, бо ў іх не хапае сродкаў, альбо яны трапляюць на тэрыторыю, дзе няма адпаведных устаноў. Аднак варта ім назбіраць некаторую суму альбо апынуцца паблізу ад гульнявой залы, як штосьці замыкаецца ў іх мозгу і ўключаецца той самы транс, які прымушае іх думаць толькі пра гульню. Пад уздзеяннем моцнай непераадольнай цягі людзі становяцца хлуслівымі, небяспечнымі для іншых, бо здольныя нават да крымінал у б учынкаў сродкаў на гульню.

— У Беларусі пакуль існуе легкадумнае стаўленне да гэтай праблемы: яна схаваная, не на паверхні. Я даўно займаюся гэтай тэмай і не чуў, каб гульнявыя ўстановы закрываліся па сваёй волі, што ў Расіі, што ў Беларусі. Значыць, у іх дастаткова кліентаў, — лічыць Ізяслаў Адліванкін. — У Расіі пачалі разумець наступствы такіх забаў, таму і было прынята рашэнне пра стварэнне чатырох гульнявых зонаў. Але шмат якія дзялкі разглядаюць Беларусь, для наведвання якой не патрэбная віза, як «запасны палігон» для бізнэсу, які небяспечны для іншых.

Адліванкін распавёў пра 65-гадовую пенсіянерку, якая прагуляла ў аўтаматы не толькі ўсе свае зберажэнні, але і кватэру. Фінал гісторыі сумны — суіцыд. Цёмны фінал цёмнай гісторыі...

Царква разглядае азартныя гульні як адзін з тых грахоў, якія найбольш праціўныя Богу. Гэта адкрылася чалавецтву дзве тысячы гадоў таму, калі на крыжы вісеў распяты Ісус Хрыстос. Яго пакуты не краналі рымскіх салдат, якія сядзелі непадалёк. Яны былі захопленыя сваёй справай, у іх кіпелі бурныя страсці. Салдаты гулялі ў косці...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Вызначце ступень залежнасці

— Як часта вы шукаеце грошы для чарговага сеансу гульні?

— Ці палохаецеся альбо адчуваеце раздражненне ў выпадку, калі гульня зрываецца?

— Ці працягваеце гульню нягледзячы на няздольнасць аддаць пазыкі?

— Ці здольныя праігнараваць істотныя прафесійныя ці вясёлыя забаўляльныя мерапрыемствы дзеля магчымасці пагуляць?

— Ці можаце забыць альбо наўмысна адкласці сямейныя справы падчас гульні?

— Ці павялічваеце ў працэсе гульні памер ставак?

— Ці бываюць выпадкі, калі вы не ў стане спыніцца і паставіць кропку ў гульні?

Калі чалавек станоўча адказаў хоць бы на чатыры з прапанаваных пытанняў, то яму варта як мага хутчэй звярнуцца да спецыяліста.

ЗДАРОЎЕ на талерцы

Тое, што злакі карысныя для нашага арганізма, — факт агульнавядомы. Чалавецтва ўжывае іх вось ужо на працягу соцень тысяч гадоў. Злакі пастаўляюць арганізму вугляводы, раслінныя бялкі, тлушчы, мінеральныя рэчывы (фосфар, жалеза, калій, кальцый, магній, селен), вітаміны (Е, В1, В2, РР і інш.). Крупы — гэта насенне злакаў. З пункту гледжання дыеталогіі, крупы — універсальны прадукт, таму іх можна ўжываць пры любым захворванні. Прымяняючы розную кулінарную апрацоўку, можна забяспечыць максімальна ашчаджальны рэжым органам страваванння (вадкія і працёртыя кашы) або выклікаць актывізацыю маторнай функцыі кішэчніка (рассыпістыя кашы). Некаторыя крупы пры разварванні выдзяляюць бялкова-крухмальную слізь, якую выкарыстоўваюць для прыгатавання слізістых супоў. Гэтыя супы ў параўнанні з іншымі першымі стравамі менш узбуджаюць страўнікавую сакрэцыю, не выклікаюць значнай перыстальтыкі кішэчніка.

АВЁС вызначаецца сярод іншых крупяных культур высокім працэнтам (6,2 %) раслінnага тлушчу. Гэты злак лёгка засвойваецца арганізмам, выводзіць цяжкія металы, халестэрын. Аўсяныя кашы ачышчаюць страўнік, нармалізуюць работу кішэчніка, пячонкі і нырак.

АЛАДКІ АЎСЯНЫЯ З ЯБЛЫКАМ

Аўсяная каша, яблык — 1 шт., мука — 2 ст. л., алей, соль, цукар — на смак.

Прыгатаваную халодную аўсяную кашу змяшаць з надзёртым яблыкам, мукой, соллю і цукрам. Перамяшаць і пячы аладкі на алеі. Падаваць гарачымі з мёдам.

ГРЭЧКА павялічвае мышачную сілу, вынослівасць, дапамагае пры парушэнні абмену рэчываў, атлусценні, цукровым дыябеце. Добра ўплывае на кроў, садзейнічае аднаўленню гемаглабіну (рэкамендуецца пры анеміі, моцным крывацёку). Стравы з грэчкі карысныя пры атэрасклерозе, хваробах пячонкі, гіпертаніі, ацёках.

КАША ГРЭЦКАЯ З ТВАРАГОМ

Грэчка — 80 г, тварог — 75 г, вада — 130 г, смятана — 30 г, яйцо, зяленіва, соль, тлушч.

Зварыць рассыпістую грэцкую кашу. Палову яе выкласці слоем на бляху, змазаную тлушчам. Зверху выкласці слой тварагу, расцёртага з жаўтком. Затым зноў слой кашы. Усё заліць смятанай і запякаць у духоўцы. Пасыпаць зяленівам.

КУКУРУЗНЫЯ КРУПЫ тармозяць працэсы браджэння і гніення ў кішэчніку. Кукурузны алей мае антысклератычнае дзеянне, дапамагае нармалізаваць абмен рэчываў. (З-за высокай каларыйнасці кукуруза не рэкамендуецца людзям з лішняй вагой.)

КУКУРУЗНАЯ КАША З ГАРБУЗОМ

Гарбуз — 1 кг, кукурузныя крупы (дробныя) — 3 шк., вада — 0,5 шк., сметанковае масла або алей — 3 ст. л., соль на смак.

Ачысціце гарбуз, нарэжце кубікамі, дадайце ваду, соль, давядзіце да кіпення і варыце 15 хвілін. Засыпце крупы і гатуйце, пастаянна памешваючы. Кашу падаваць гарачай, паліўшы алеем.

МАННЫЯ КРУПЫ атрымліваюць пры размоле пшаніцы. Яны хутка разварваюцца, утрымліваюць мінімальную колькасць клятчаткі (харчовае валакно), добра засвойваюцца, таму найбольш прыдатныя для дзіцячага і дыетычнага харчавання.

МАННІК ЯГАДНЫ

0,5 шк. манных круп, 1,5 шк. вады, 0,5 шк. ягаднага соку, 1 ст. л. цукру, 2 ч. л. варэння.

Зварыць вязкую манную кашу, але перад тым, як засыпаць крупы, у ваду дадаць сок і цукар. Кашу разліць у талеркі. Калі яна застыне, нарэзаць на порцыі. Зверху паліць варэннем.

ПРОСА ў народзе цэніцца як прадукт, які дае сілу, умацоўвае цела. Проса перашкаджае адкладанню тлушчу, станоўча ўплывае на работу сардэчна-сасудзістай сістэмы, пячонкі, садзейнічае кроваўтварэнню. (Пры захворваннях страўнікава-кішачнага тракта не рэкамендуецца з-за цяжкага ператраўлівання.)

ПРАСЯНАЯ КАША З ФРУКТАМІ І МЁДАМ

Проса — 50 г, чарнасліў — 30 г, абрыкос сушаны — 20 г, разынкі — 20 г, малако — 1,5 шк., масла сметанковае — 20 г, цукар — 5 г, мёд — 30 г.

Добра прамытае проса ўсыпаць у кіпячае малако, дадаць цукар, масла і варыць, пакуль загусцее; затым дадаць прамытую садавіну, вымешаць, шчыльна накрыць і на 2—3 гадзіны паставіць у цёплую духоўку або на пліту. Падаваць на стол з маслам. Асобна падаць мёд.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Карвалол у рэцэптурны водпуск не трапіў

Я пачула нядаўна ў аптэцы, што карвалол і некаторыя іншыя сардэчныя лекі будуць прадавацца толькі па рэцэптах. Няўжо гэта праўда?

Т.М. ГАЎРЫЛЮК, *г. Мінск*

Адразу заўважым, што гэтыя чуткі з'явіліся не на пустым месцы. Нядаўна за подпісам міністра аховы здароўя Васіля Жарко з'явіўся ліст «Аб уліку камбінаваных псіхатропных рэчываў». У гэтым дакументе, у прыватнасці, гаворыцца, што, паводле інфармацыі МУС, у дадзены час нарказалежныя асобы шырока выкарыстоўваюць у незаконным абароце камбінаваныя лекавыя сродкі, якія ўтрымліваюць небяспечныя псіхатропныя рэчывы (эфедрын, фенабарбітал і псеўдаэфедрын), а таксама лекавыя сродкі, якія ўтрымліваюць дэкстраметарфан. У хатніх умовах кустарным спосабам з лекавых сродкаў, якія змяшчаюць эфедрын, яны атрымліваюць асабліва небяспечныя псіхатропныя рэчывы, якія не выкарыстоўваюцца ў медыцынскіх мэтах, а таксама выдзяляюць эфедрын і псеўдаэфедрын.

У сувязі з гэтым Міністэрства аховы здароўя прапанавала з 1 сакавіка 2008 года паставіць на прадметна-колькасны ўлік у арганізацыях аховы здароўя і аптэках, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на дзейнасць, звязаную з абаротам наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў, наступныя лекавыя прэпараты, якія ўтрымліваюць эфедрын і фенабарбітал у камбінацыі з іншымі фармакалагічна актыўнымі рэчывамі: таблеткі «Тэафедрын-Н» вытворчасці «Масххімпрэпараты» і таблеткі «Т-Федрын» вытворчасці кампаніі Elegant India (Індыя). Для «Т-Федрына» норма адначасовай рэалізацыі пры выпісванні па рэцэпце абмежаваная 60 таблеткамі.

Разам з тым такі камбінаваны лекавы сродак, як «Мультынол» (парашок для прыгатавання раствору для прыёму ўнутр) цяпер дазволена рэалізоўваць толькі суб'ектам гаспадарання, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на дзейнасць, звязаную з абаротам наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў.

Што датычыцца іншых камбінаваных лекавых сродкаў, якія ўтрымліваюць псіхатропныя рэчывы эфедрын, псеўдаэфедрын, а таксама фенабарбітал і наркатычнае рэчыва кадэін (такіх, як «Пенталгін-Н», «Пенталгін ICN» і «Седальгін-Нео» ў таблетках), то іх водпуск будзе ажыццяўляцца толькі па рэцэптах. Выключна па рэцэптурным водпуску будуць рэалізоўвацца мікстура «Бромгексін Плюс», сіропы «Бронхаліцін», «Бронхатон», «Бронхацын», «Супрэкс» «Трыатэкс», таблеткі «Далерон Колд З» і парашок для прыгатавання раствору «Мультысімптом». Як вядома, «Карвалол», «Карвалдзін», «Валакардзін», таблеткі «Корвалтаб», «Андзіпал» і некаторыя іншыя лекавыя прэпараты таксама ўтрымліваюць псіхатропнае рэчыва фенабарбітал, але яго доза ў гэтых леках зусім нязначная. Таму на сёння яны застаюцца ў безрэцэптурным водпуску.

ДЭФЕКТЫ РАДЫЯЦЫІ

Ці можна лічыць бяспечнымі для чалавека малыя дозы радыяцыі? Магчыма, яны здольны выклікаць дэфекты развіцця ў будучых пакаленняў?

Тэма радыяцыйнага забруджвання звязана ў нашага насельніцтва найперш з замоўчваннем наступстваў трагедыі на ЧАЭС. Гэта сітуацыя абудзіла ў душах людзей страх, які стаў для многіх самым горшым наступствам тагачасных падзей. Перабольшваць небяспеку радыяцыйнага забруджвання гэтак жа злачынна, як і змяншаць яе, мяркуе прафесар, доктар біялагічных навук, загадчыца лабараторыі генетыкі чалавека і жывёл Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ірма МАСЭ. На яе думку, і ў гэтым складаным пытанні неабходна прытрымлівацца ўзважанай пазіцыі.

Наогул стымулюючае ўздзеянне малых дозаў радыяцыі добра вядома. Без іх немагчыма ўявіць радонавыя ванны, карысныя для лячэння многіх захворванняў. Малыя дозы радыяцыі павялічваюць ўсходжасць раслін. У лабараторных умовах заўважана нават згасанне жыццядзейнасці пры іх адсутнасці. Аднак разам з тым вучоныя дапускаюць, што любое апрамяненне, у тым ліку вельмі нязначнае, можа выклікаць пашкоджанне ДНК. Радыяцыйны электрон здольны пашкодзіць клетку, але якімі будуць наступствы ў дадзеным выпадку — пакуль невядома.

— Тэарэтычна малыя дозы радыяцыі могуць выклікаць мутацыі ў чалавечай папуляцыі, — расказвае Ірма Барысаўна. — Але чамусьці гэта не выяўляецца на практыцы. Пасля падзей Хірасімы і Нагасакі вучоныя працяглы час даследавалі магчымасці павелічэння мутацый у мясцовага насельніцтва. Паралельна вывучаліся і людзі, якія падвяргаліся радыяцыйнай тэрапіі, шахцёры ўранавых руд, але ніякіх генетычных дэфектаў выяўлена не было. Ці азначае гэта, што яны не могуць узнікаць у рынцыпе? Вось гэта вельмі складанае пытанне. Па-першае, з-за адсутнасці дакладных метадаў даследавання. З жывёламі і раслінамі куды прасцей. Мы іх апраменьваем і глядзім, колькі ўзнікла мутацый. З чалавекам — прынцыпова іншая сітуацыя. На яго ўздзейнічае шэраг розных фактараў — стрэсавы, хімічны, вірусны і г.д. Самыя розныя фактары могуць як павялічваць уздзеянне радыяцыі, так і аслабляць. Да таго ж, у нашым арганізме ёсць шмат сістэм, здольных аднавіць пашкоджанне, выбракаваць пашкоджаныя клеткі. А такое рэчыва, як меланін дадзена нам прыродай для абароны ад ультрафіялетавага і радыяцыйнага апраменьвання. Меланін недарэмна ёсць ва ўсіх жывых істот. Малекулы гэтага рэчыва здольны як «збіраць» электроны, якія атакуюць арганізм, так і аддаваць іх, аднаўляць нястачу. Такім чынам, малекулы меланіну перахопліваюць радыяцыйную энергію і ператвараюць яе ў... цеплыню. У свеце ўжо створаны розныя радыепратэктары. Але прынцып іх дзеяння дазваляе абараняць клеткі арганізма толькі ад аднаразовага вострага апраменьвання. Прыродны ж меланін абараняе нас пры працяглым уздзеянні малых дозаў...

Генетычныя парушэнні, якія спрабуюць адшукаць і, на шчасце, пакуль не адшукваюць вучоныя — гэта спадчынныя хваробы, дэфекты і выродлівасці. Гэта і такое захворванне, як сіндром Даўна, і біяхімічныя адхіленні — мукавісцыдоз, фенілкетанурыя. Радыяцыя можа іх выклікаць, але ніхто не даказаў, што ў той жа Японіі ці Беларусі пасля сумна вядомых падзей такіх выпадкаў стала больш. Сапраўды, людзі і жывёлы з дэфектамі і выродлівасцямі нараджаліся на працягу ўсяго існавання чалавецтва.

— У Японіі спрабавалі даследаваць і мутацыі палавых храмасомаў, — удакладняе Ірма Барысаўна. — Калі ў палавой Х-храмасоме ўзнікаюць мутацыі, то перастаюць нараджацца хлопчыкі. Гэта даказана на жывёлах. Калі б пасля атамнай бамбардзіроўкі ў Японіі пачало нараджацца больш дзяўчынак, можна было б меркаваць, што мутацыі выклікала радыяцыя. Але гэта раўнавага не была парушана. У Японіі, дарэчы, самымі сур'ёзнымі даследаваннямі былі ахоплены каля 100 тысяч чалавек, якія падвергліся радыяцыйнаму апраменьванню. І было ўстаноўлена, што частата нараджэння дзяцей з д

ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ ПАЧАЛОСЯ?

Летам у Еўропе выпадае снег, а зімой стаіць нязвыкла высокая тэмпература. Што гэта? Кажуць, глабальнае пацяпленне. Калі так пойдзе і далей, то праз дзесяць гадоў у Беларусі можна будзе вырошчваць вінаград. А яшчэ — ураганы, навадненні і цунамі атакуюць планету ўсё часцей. Калі паўстагоддзя таму ўрон ад стыхійных бедстваў ацэньваўся ў 4 мільярды долараў за год, то цяпер прыродныя катаклізмы наносяць шкоду ў дзесяць разоў большую. Што ж насамрэч адбываецца з кліматам? Аб гэтым падчас «прамой лініі» на Беларускім радыё расказала дырэктар Дэпартамента па гідраметэаралогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, кандыдат тэхнічных навук Марыя ГЕРМЯНЧУК. У размове ўдзельнічаў і журналіст «Звязды».

ЭКСТРЭМАЛЬНЫЯ ЗВЕСТКІ

За апошнія дваццаць гадоў у Еўропе сярэднегадавая тэмпература павялічылася на 0,7—0,8 градуса. А ў Беларусі і таго больш — на 1,1 градуса. Даследчыкі сцвярджаюць, што надвор'е няўхільна змяняецца, прычым у глабальным маштабе, і ад гэтага нікуды не схавацца.

— Пераўтварэнні навакольнага асяроддзя адбываюцца не толькі з-за павышэння тэмпературы, але і па іншых прычынах. Выпадае вялікая колькасць ападкаў, праносяцца ўраганы, хвалі цяпла, паступаюць палярныя паветраныя патокі. Экстрэмальныя з'явы апошніх гадоў сведчаць аб тым, што кліматычная сістэма ў нашай краіне і ўвогуле ў свеце змяняецца. Пры гэтым у апошнія гады колькасць экстрэмальных з'яў у прыродзе, якія звязаны з павелічэннем тэмпературы, перавышае колькасць з'яў, якія звязаны з панжэннем.

ЛЁД У АРКТЫЦЫ РАСТАЕ

Літаральна днямі ад Антарктыды адкалоўся гіганцкі айсберг плошчай у 78 квадратных кіламетраў. Пакуль невядома, адбылося гэта з-за глабальнага пацяплення, ці не. Але ўвогуле, кліматолагі лічаць, што праз дзесяць—пятнаццаць гадоў слой лёду ў раёне вечнай мерзлаты, у Арктыцы, часткова растане, і гэта прывядзе да змянення тэмпературы на ўсёй планеце. Напрыклад, у Беларусі яна павялічыцца настолькі, што можна будзе без клопатаў вырошчваць вінаград. Ці праўда гэта?

— Так, па прагнозах, калі змяненні клімату будуць крочыць такімі ж тэмпамі, як і цяпер, існуе небяспека, што ў Арктыцы лёд пачне раставаць вельмі хутка, — лічыць Марыя Германчук. — Гэта нядобра, таму што «паводзіны» паветраных мас у атмасферы звязаны са станам сусветнага акіяна. Уявіце, паўночная шапка лёду ператворыцца ў масу вады, якая будзе паглынаць цеплавую энергію. Тэмпература павялічыцца, парушыцца цеплавы баланс. Межы зоны вечнай мерзлаты зменяцца, адступяць на поўнач. Гэты працэс пачынаецца ўжо ў Канадзе і Расіі, дзе камунікацыі ў некаторых месцах тэхнічна ўжо не адпавядаюць стану навакольнага асяроддзя.

А вось наконт вінаграду не ўсё так проста. Для вырошчвання цеплалюбівых культур, аднаго сонечнага цяпла недастаткова. Неабходна яшчэ мець і падрыхтаваную глебу, уносіць угнаенні, каб вырабляць канкурэнтаздольны прадукт. Таму гэта больш эканамічнае пытанне.

ЯК ПІВА АД НАДВОР'Я ЗАЛЕЖЫЦЬ

Паводле гістарычных звестак, у 1640-1670 гадах у Паўночнай Германіі нечакана ў тры разы павялічылася вытворчасць піва. І звязана гэта было... са зменненем клімату. Справа ў тым, што тады вымерзла большая колькасць вінаградніка. Але вытворцы хутка зарыентаваліся — і насельніцтва перайшло на ўжыванне не віна, а таго прадукту, які быў даступны — на піва. Такім чынам, эканоміка хутка адаптавалася да змянення клімату. Вось і цяпер ад дакладных прагнозаў залежыць не толькі пытанне, браць з дому парасон ці не. Ад змянення клімату залежыць дабрабыт краіны.

— Трэба заўсёды памятаць, што змяненні клімату адбываюцца ў радзёнах планеты па-рознаму, дзесьці становіцца халадней ці цяплей. І гэта істотна ўплывае на жыццё людзей. Напрыклад, узгадаем аб праблеме паводак. Напрыклад, у Цэнтральнай Еўропе на працягу 300—400 гадоў паводак практычна не было, і людзі спакойна сяліліся ў далінах рэк. Цяпер, калі пачынаюць раставаць высакагорныя ледавікі, гэтыя месцы ператвараюцца ў зоны бедства, становяцца небяспечнымі, але насельніцтва і ўлады не заўсёды падрыхтаваныя да гэтага. У Беларусі сітуацыя крыху іншая, у нас усё жыццё на Палессі тапіла, людзі да гэтай справы прызвычаіліся, і вясна без паводкі для іх — нонсэнс. Сёння ўзведзены інжынерныя пабудовы, якія дазваляюць пазбегнуць затаплення ў буйных маштабах, пазбегнуць матэрыяльных і чалавечых страт.

Таму, калі адбываюцца пераўтварэнні ў прыродзе, эканоміка любой краіны стыхійна адаптуецца да іх. З іншага боку, неабходны намаганні на ўзроўні дзяржавы, для таго каб прадухіліць урон ад змяненняў клімату, ад гідралагічных, метэаралагічных з'яваў. І яшчэ трэба стварацъ умовы для галін эканомікі, каб атрымацъ максімальную выгаду ад гэтых змяненняў. У Беларусі на нашы прагнозы арыентуюцца прадпрыемствы энергетыкі, будаўніцтва. Ускосным чынам ад прагнозаў залежыць і прадухіленне дзяржаўных страт, якія могуць наступіць пры нейкіх экстрэмальных праявах клімату. Па ацэнках экспертаў Сусветнага банка, на рубель, укладзены ў беларускую гідраметэаралагічную службу, аддача ў выглядзе прадухілення з'яў, прамых даходаў, эфектыўнасці планавання складае 5 рублёў. Гэта вельмі высокі ўзровень сярод краін Еўропы.

ЦІ МОЖНА СКЛАСЦІ ПРАГНОЗ НА БУДУЧАЕ?

За ўвесь час існавання нашай планеты змяненні клімату адбываліся цыклічна, і гэта даказана. За ім назіралі дастаткова даўно, у старажытнасці таксама рабілі запісы, спрабавалі скласці аналіз будучых змяненняў, прагназаваць паводзіны надвор'я. Дарэчы, у апошні час колькасць анекдотаў пра недакладнасць прагнозаў надвор'я істотна паменшылася. Несур'ёзны, здавалася б, факт, але ўсё роўна сведчыць, што давер людзей да тых, хто «адказвае» за надвор'е, стаў большым. У беларускіх метэаролагаў з'яўляецца новае абсталяванне, яны актыўна супрацоўнічаюць з калегамі з іншых краін. Пры ўсім гэтым, ці магчыма прагназаваць, які клімат будзе ў нашай краіне праз стагоддзе?

— Тады трэба дакладна вызначыцца з тэрмінам прагнозаў. У кантэксце «50—100 гадоў», вядома ж, складана што-небудзь сказаць, таму што будзе складана потым праверыць гэтыя даныя. Калі ж весці размову аб прагнозах гадоў на пяць, дзесяць наперад, то іх рабіць таксама няпроста, звязаны з тым, што будучыя экстрэмальныя з'явы, якія вызначыць вельмі складана, істотным чынам мяняюць малюнак. А перадумовы для іх з'яўленне фарміруюцца за некалькі дзён ці нават гадзін да таго, як капрызы надвор'я пачынаюць праяўляцца. Дарэчы, для стварэння будучых прагнозаў вельмі важна штодзень назіраць за надвор'ем: тэмпературай, напрамкам і хуткасцю ветру, ціскам, вільготнасцю.

ЦІ ДАВЯРАЦЬ ІНТЭРНЭТ-НАДВОР'Ю?

Тое, што адчуванне некаторых людзей залежыць ад стану надвор'я — праўда. Даводзілася сустракацца з меркаваннямі, што беларускія спецыялісты могуць памыляцца, затое на пэўнай Інтэрнэт-старонцы прагноз на некалькі дзён наперад — самы дакладны. Ці правільна будзе давяраць даным Інтэрнэту, ці з'яўляецца электроннае павуцінне крыніцай дакладных сведак?

— Бязумнае выкарыстанне матэрыялаў з Інтэрнэту заўсёды ставіць чалавека ў сітуацыю, калі ён мае інфармацыю, але не мае магчымасці праверыць яе дакладнасць. Сайтаў дастаткова, але паўстае пытанне — ці цалкам яны задавальняюць патрэбы чалавека. Напрыклад, па «афіцыйных» прагнозах за вокнамі +5 градусаў, а хочацца, каб было +10. І шукаюць там, дзе будзе змешчана: дзесяць градусаў. А потым, калі выходзяць на вуліцу, дзе надвор'е і сапраўды халоднае, не такое, як абяцалі на якім-небудзь сайце, пачынаецца — ці то Гідраметэацэнтр не тое сказаў, ці то яшчэ што-небудзь. Трэба карыстацца надзейнымі крыніцамі інфармацыі аб надвор'і і ў гэтым выпадку для нашай краіны найбольш прыдатнай крыніцай з'яўляюцца прагнозы Рэспубліканскага Гідраметэацэнтра Дэпартамента па гідраметэаралогіі Мінпрыроды Беларусі.

А ўвогуле, дрэннага надвор'я не бывае. Марыя Гермянчук зазначае — сапраўды, калі б не дождж, снег, вецер, колькі б людзей не змаглі пазнаёміцца, колькі жанчын і мужчын не мелі б магчымасці закахацца адно ў аднаго? А якую яшчэ знайсці трапную нагоду, каб пачаць размову з незнаёмкай на вуліцы, як не паскардзіцца на надвор'е? Таму галоўнае, безумоўна, якое надвор'е ў доме, а ўсё астатняе можна лёгка змяніць.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«АЎТАРЫТЭТ АЦЭНЬВАЕЦЦА ПА РЭАЛЬНЫХ СПРАВАХ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Калі адбываюцца такія пазітыўныя зрухі на вытворчасці, то, напэўна, паляпшаецца і дабрабыт людзей?

— Безумоўна, павялічваецца ўзровень аплаты працы — на працягу мінулага года рэальная заработная плата вырасла на 21,6 працэнта. Сярэдні заробак летась у снежні склаў 514 долараў. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у сталіцы. Найбольш хуткімі тэмпамі заработная плата павялічвалася ў навукоўцаў (гэтая галіна разам з банкамі і страхаваннем — сярод лідараў), што абумоўлена інавацыйным шляхам развіцця эканомікі на бліжэйшую перспектыву. Узровень аўтамабілізацыі насельніцтва Савецкага раёна на чвэрць вышэйшы, чым сярэднегарадскі.

«СЭРВІС — НА СУЧАСНЫМ УЗРОЎНІ»

— Наколькі адпавядае сэрвіс узроўню заробкаў?

— На працягу апошніх гадоў тэмпы росту аб'ёмаў аказання платных паслуг даволі высокія. Мы імкнёмся задаволіць попыт на якасны сэрвіс. Цяпер у раёне працуюць амаль 400 крамаў, 146 аб'ектаў грамадскага харчавання і 269 — бытавога абслугоўвання, 12 гандлёвых цэнтраў і 2 рынкі (адзін з якіх самы буйны не толькі ў сталіцы, але і ва ўсёй Беларусі, — Камароўскі). Так што сетка даволі вялікая і яна ўвесь час пашыраецца. Напрыклад, толькі летась адкрыліся 34 крамы і 11 аб'ектаў грамадскага харчавання. Пашыраецца колькасць гандлёвых аб'ектаў, якія аснашчаны плацежнымі тэрміналамі для безнаяўных разлікаў за тавары і паслугі з выкарыстаннем банкаўскіх пластыкавых картак. Такая сістэма выкарыстоўваецца ў 78 крамах. У мінулым годзе плацежныя тэрміналы былі ўстаноўлены ў 14 арганізацыях гандлю і грамадскага харчавання.

У раёне выконваюцца абсалютна ўсе дзяржаўныя сацыяльныя стандарты, якія вызначаны для адпаведных адміністрацыйных тэрыторый. Асобныя з іх перавышаюць устаноўлены мінімальны ўзровень. Напрыклад, нарматыў забяспечанасці насельніцтва гандлёвымі плошчамі фактычна ў 2,5 раза вышэйшы за зацверджаны мінімальны паказчык, а забяспечанасці месцамі агульнадаступнай сеткі аб'ектаў грамадскага харчавання — у 1,6. Такая ж сітуацыя па шэрагу пазіцый стандартаў бытавога абслугоўвання (рамонту швейных вырабаў — у 3,2 раза, рамонту абутку — у 2,9, фотапаслугі — у 5,4, паслугі цырульняў — увогуле ў 6,4 раза). Так што сэрвіс на сучасным узроўні і магчымасці насельніцтва ўвесь час пашыраюцца. Зараз узводзіцца 6 гандлёвых цэнтраў, у планах будаўніцтва 5 паркінгаў (акрамя тых 5, што ўжо працуюць). Апошнія пазіцыі надзвычай запатрабаваная, паколькі ўзровень аўтамабілізацыі насельніцтва сталіцы павялічваецца проста вялізнымі тэмпамі — гэта таксама неабходна ўлічваць.

— Якая роля ў развіцці эканомікі раёна прыватнага сектара?

— Удзельная вага гэтага сектара ў паступленні плацяжоў у бюджэт раёна летась склала амаль 38 працэнтаў ад агульнага аб'ёму. Якія тут яшчэ могуць быць лепшыя характарыстыкі ролі прыватнікаў у эканоміцы? Яны фарміруюць актыўнае канкурэнтнае асяроддзе, вырабляюць у тым ліку і экспартную прадукцыю, забяспечваюць занятасць насельніцтва. Таму мы не падзяляем на дзяржаўнае і недзяржаўнае — усе прадпрыемствы (у тым ліку сярэднягa і малога бізнэсу, індывідуальныя прадпрымальнікі), якія працуюць у межах вызначанага нарматыўнага поля, у рэшце рэшт выконваюць агульную задачу — узмацняюць сацыяльна-эканамічнае становішча. Гэта варта дакладна разумець. Нездарма яшчэ сем гадоў таму ў раёне быў створаны Савет па развіцці прадпрымальніцтва (дарэчы, першы ў горадзе). Такая тут спецыфіка — сярод жыхароў вялікая колькасць інтэлігенцыі, асобныя з гэтых людзей у складаныя часы пайшлі ў бізнэс і цяпер развіваюць уласную справу. Зразумела, неабходна было іх падтрымаць. Цяпер нават існуе такая форма — субсідыі для арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. Летась такая падтрымка ў памеры 21 мільёна рублёў была аказана 12 беспрацоўным. Гэта, як я лічу, адна з эфектыўных формаў арганізацыі занятасці — чаму б не даць чалавеку шанц? Пры жаданні кожны можа знайсці сабе справу па душы. І знаходзяць, паколькі ёсць розныя варыянты: узровень зарэгістраванага беспрацоўя нарыканцы мінулага года склаў 0,4 працэнта ад колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. На 1 студзеня 2008-га ў раённым аддзяленні занятасці стаяла на ўліку амаль на 28 працэнтаў людзей менш, чым на такую ж дату летась.

«ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА АБ'ЁМЫ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ»

— Распрацаваны пералік інвестыцыйных праектаў, якія трэба рэалізаваць на працягу бліжэйшых трох гадоў. Што мяркуецца зрабіць у межах гэтай праграмы?

— На працягу апошніх гадоў у раёне ўтрымліваліся высокія тэмпы інвеставання асноўнага капіталу. Летась адпаведная лічба склала 466 мільярдаў рублёў, больш за палову гэтай сумы — уласныя сродкі арганізацый. Цяпер распрацаваны пералік перспектыўных інвестыцыйных праектаў тэрытарыяльнага развіцця Савецкага раёна на перыяд 2008—2010 гадоў. Гэтым дакументам прадугледжана, што будзе рэалізавана 172 праекты з прыцягненнем 1,3 трыльёна рублёў. Пры гэтым пазабюджэтныя сродкі складуць 1,1 трлн рублёў — такім чынам, на 85,1 працэнта развіццё тэрыторыі будзе забяспечана за кошт гэтых крыніц.

— Адпаведныя праекты будуць рэалізоўвацца і ў жыллёвым будаўніцтве?

— На працягу бліжэйшых трох гадоў у межах 17 адпаведных праектаў плануецца ўзвесці 40 шматкватэрных жылых дамоў. Увогуле аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва будуць стабільна павялічвацца: калі ў мінулым годзе было здадзена ў эксплуатацыю 41,1 тысячы квадратных метраў жылля, то сёлета — ужо 79 тыс., а ў 2009-м — 139 тыс. Спецыфіка раёна — адсутнасць свабодных пляцовак. Між тым, чарга тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, даволі вялікая. Таму ўпраўленнем капітальнага будаўніцтва распрацоўваецца маштабны праект узвядзення 19 дамоў на месцах, дзе ў асноўным цяпер размешчаны двухпавярховыя будынкі. Пад забудову пойдзе і частка прыватнага жылога сектара. Дарэчы, людзі даволі актыўна будуюцца і без дзяржаўнай падтрымкі — гэта ў асноўным моладзь, колькасць якой, дарэчы, у раёне павялічваецца. Апошнім часам паляпшаецца дэмаграфічная сітуацыя — змяншаецца натуральнае скарачэнне колькасці жыхароў, больш рэгіструецца шлюбаў. У трох ВНУ, дзевяці каледжах і вучылішчы, якія размешчаны на тэрыторыі раёна, займаюцца амаль 61 тысяча студэнтаў і навучэнцаў. Разам з тым у нас больш чым 44 тыс. пенсіянераў. Гэтыя дзве рысы падкрэсліваюць адметнасць тэрыторыі і вызначаюць спецыфіку работы. Дынамічна развіваецца сацыяльная сфера: праводзіцца грунтоўны рамонт шэрагу найважнейшых аб'ектаў (школ, паліклінік і інш.), узмацняецца іх матэрыяльна-тэхнічная база. У 2002 годзе пачала працаваць Беларуская нацыянальная гімназія № 23. Узровень ведаў, якія атрымліваюць навучэнцы, даволі высокі: летась 78,4 працэнта выпускнікоў школ паступілі ў ВНУ — лепшы паказчык у горадзе. Не забываем і пра старэйшае пакаленне — вялікая ўвага надаецца рэалізацыі важкага пакета сацыяльных праграм. Напэўна ж, нездарма пяць гадоў запар Савецкі раён з'яўляецца прызёрам у гарадскім сацыяльна-эканамічным спаборніцтве, а ў 2004-м занесены на Рэспубліканскую Дошку гонару. Так што сваё 70-годдзе сустракаем на ўздыме, станоўчую дынаміку маем намер працягваць і надалей. Паколькі цудоўна разумеем, што аўтарытэт ацэньваецца па канкрэтных справах.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Рэха публікацыі

МАНАСТЫР ДЗЯКУЕ ЗА ДАПАМОГУ

5 сакавіка ў «Звяздзе» быў апублікаваны артыкул «Вяртанне Лаўры» пра адраджэнне аднаго з самых старажытных манастыроў на тэрыторыі нашай Бацькаўшчыны.

Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі манастыр быў заснаваны сынам літоўскага князя Трайната прападобным Елісеем Лаўрышаўскім каля 1225 года ў лукавіне на левым беразе Нёмана, ля падножжа высокага ўзгорка. З цягам часу манастыр разрос ся і стаў лаўрай — адзінай вядомай нам у гісторыі Беларусі. Тут у 1329 годзе было напісана рукапіснае Евангелле — помнік беларускага кнігапісання, які цяпер захоўваецца ў бібліятэцы імя Чартарыжскіх у Кракаве. Лаўрышаўскі манастыр двойчы адраджаўся — у XVI стагоддзі і на пачатку XX. У 1997 годзе пачалося трэцяе адраджэнне Лаўрышаўскага манастыра. Летась ён ужо быў зарэгістраваны, цяпер сюды з кожным днём расце паток паломнікаў. Паводле падання, калі манастыр канчаткова адродзіцца, будуць з'яўлены святыя цудатворныя мошчы заснавальніка манастыра Елісея Лаўрышаўскага.

У публікацыі «Вяртанне Лаўры» расказвалася не толькі пра гісторыю і сённяшні дзень манастыра, але і змяшчаўся разліковы рахунак для тых, хто хоча ўдзельнічаць у адраджэнні святыні. Благачынны манастыра іераманах Яўсевій (Цюхлоў) дзякуе ўсіх, хто адгукнуўся. Практычна кожны дзень на рахунак манастыра паступаюць грошы з усіх куткоў Беларусі, і нават з Расіі. Не засталіся ўбаку мясцовыя ўлады і прадпрыемствы. Краснасельскі цэментны завод (г. Ваўкавыск) ахвяраваў 5 млн беларускіх рублёў. Завод па вытворчасці блокаў (г. Смаргонь) ахвяраваў 200 кубаметраў некандыцыйных сілікатных блокаў — гэта практычна палова брацкага корпусу, будаўніцтва якога ўжо пачалося. Нехта з паломнікаў паабяцаў ахвяраваць грошы на 100 тысяч штук цэглы — гэта 41 млн беларускіх рублёў. Будаўнічая фірма з Мінска ахвяравала еўравагонку. Навагрудскі райвыканкам перадаў манастыру будынак былой бібліятэкі для гасцініцы — ужо напрыканцы лета яна зможа прыняць паломнікаў.

«У манастыры штодня ўзносяцца малітвы за ўсіх ахвяравальнікаў, — кажа айцец Яўсевій. — Людзі, якія дапамагаюць у адраджэнні манастыра — тым самым праслаўляюць Бога, дзякуюць яму за нашу зямлю, за сваё жыццё, за тую прыгажосць, якая нас акружае. Яны просяць аб міласці да сябе і сваіх блізкіх. Нават маленькая ахвяра сведчыць пра велікадушнасць чалавека і абавязкова будзе заўважана Богам».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Разліковы рахунак Свята-Елісееўскага Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра 3015205150018 ААТ «Белаграпрамбанк» г. Навагрудак, Гродзенская вобласць, УНН 590557014, код 449.

Ёсць ідэя!

І лічыце сябе... Звяздоўцам

Гэтыя два лісты прыйшлі ў рэдакцыю амаль адначасова. Чытаю «Звязду», — піша ў першым Яўгенія КУЛЕВІЧ са Смаргоншчыны — і пастаянна баюся. Баюся, што газета можа знікнуць, загінуць, бо вельмі ж яна цікавая.

Некаму, на першы погляд, гэта думка падасца супярэчлівай: як гэта — цікавая, ды загінуць? Але на другі — усё ў ёй правільна. Бо для каго цікавая наша «Звязда»? Для беларускамоўных гараджан, для вяскоўцаў.

Але ж іх мала. У некага вочы ўжо не тыя, у некага грошай няма. Але ж па-беларуску, «па-свойму», як кажа мая суседка, чытаць яны хочуць!

Бывае, атрымаўшы свежы нумар, я хоць пераказваю ім асобныя артыкулы пра лёсы людзей, пра нашу мінуўшыну, традыцыі і мары. Дарэчы, у апошні час колькасць анекдотаў пра недакладнасць прагнозаў надвор'я істотна паменшылася. Несур'ёзны, здавалася б, факт, але ўсё роўна сведчыць, што давер людзей да тых, хто «адказвае» за надвор'е, стаў большым. У беларускіх метэаролагаў з'яўляецца новае абсталяванне, яны актыўна супрацоўнічаюць з калегамі з іншых краін. Пры ўсім гэтым, ці магчыма прагназаваць, які клімат будзе ў нашай краіне праз стагоддзе?

— Тады трэба дакладна вызначыцца з тэрмінам прагнозаў. У кантэксце «50—100 гадоў», вядома ж, складана што-небудзь сказаць, таму што будзе складана потым праверыць гэтыя даныя. Калі ж весці размову аб прагнозах гадоў на пяць, дзесяць наперад, то іх рабіць таксама няпроста, звязаны з тым, што будучыя экстрэмальныя з'явы, якія вызначыць вельмі складана, істотным чынам мяняюць малюнак. А перадумовы для іх з'яўленне фарміруюцца за некалькі дзён ці нават гадзін да таго, як капрызы надвор'я пачынаюць праяўляцца. Дарэчы, для стварэння будучых прагнозаў вельмі важна штодзень назіраць за надвор'ем: тэмпературай, напрамкам і хуткасцю ветру, ціскам, вільготнасцю.

ЦІ ДАВЯРАЦЬ ІНТЭРНЭТ-НАДВОР'Ю?

Тое, што адчуванне некаторых людзей залежыць ад стану надвор'я — праўда. Даводзілася сустракацца з меркаваннямі, што беларускія спецыялісты могуць памыляцца, затое на пэўнай Інтэрнэт-старонцы прагноз на некалькі дзён наперад — самы дакладны. Ці правільна будзе давяраць даным Інтэрнэту, ці з'яўляецца электроннае павуцінне крыніцай дакладных сведак?

— Бязумнае выкарыстанне матэрыялаў з Інтэрнэту заўсёды ставіць чалавека ў сітуацыю, калі ён мае інфармацыю, але не мае магчымасці праверыць яе дакладнасць. Сайтаў дастаткова, але паўстае пытанне — ці цалкам яны задавальняюць патрэбы чалавека. Напрыклад, па «афіцыйных» прагнозах за вокнамі +5 градусаў, а хочацца, каб было +10. І шукаюць там, дзе будзе змешчана: дзесяць градусаў. А потым, калі выходзяць на вуліцу, дзе надвор'е і сапраўды халоднае, не такое, як абяцалі на якім-небудзь сайце, пачынаецца — ці то Гідраметэацэнтр не тое сказаў, ці то яшчэ што-небудзь. Трэба карыстацца надзейнымі крыніцамі інфармацыі аб надвор'і і ў гэтым выпадку для нашай краіны найбольш прыдатнай крыніцай з'яўляюцца прагнозы Рэспубліканскага Гідраметэацэнтра Дэпартамента па гідраметэаралогіі Мінпрыроды Беларусі.

А ўвогуле, дрэннага надвор'я не бывае. Марыя Гермянчук зазначае — сапраўды, калі б не дождж, снег, вецер, колькі б людзей не змаглі пазнаёміцца, колькі жанчын і мужчын не мелі б магчымасці закахацца адно ў аднаго? А якую яшчэ знайсці трапную нагоду, каб пачаць размову з незнаёмкай на вуліцы, як не паскардзіцца на надвор'е? Таму галоўнае, безумоўна, якое надвор'е ў доме, а ўсё астатняе можна лёгка змяніць.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

Такі ліст прыйшоў і ад Яўгеніі Кулевіч. Ён, як і ліст Уладзіміра Іванавіча Саўчыка са Светлагорскага раёна, які мы надрукуем крыху пазней, — пра тое, што ўсё гэта блізкае, усё дарагое — ім. А рабочаму?.. Ці якому чыноўніку? Ён, мо, і не помніць ужо нічога — ні хаты, ні вёскі, ні мовы. Не будзе выпісваць ды яшчэ і з іншых пасмяецца.

Што ж нам рабіць?

Адказ на пытанне, як вы, мо, здагадаліся, у другім лісце — ад **Уладзіміра Іванавіча САЎЧЫКА са Светлагоршчыны.** Па закону, піша ён, мовы ў нашай краіне дзве і, як быццам, роўныя. Але ж беларускай, гэта значыць, першай дзяржаўнай, не пачуеш амаль нідзе — ні ў крамах, ні ў транспарце, ні па тэлебачанні, ні ў калідорах улады. Атрымліваецца, што ўсе краіны, усе народы ганарацца сваімі мовамі, а што ж мы?..

Мы, працягвае Уладзімір Іванавіч, не павінны жыць, як нейкае племя ў Афрыцы, мову якога ніхто не прызнае: на базе «Звязды» мы павінны стварыць клуб «Наша Радзіма». Усе, хто газету выпісвае, у яго ўступаюць. Гэта будзе добры пачатак, а далей — болей... Бо «калі страцім мову, унукі і праўнукі нам не даруюць»...

Згадзіцеся, дарагога каштуе і гэта трывога за лёс старэйшай беларускай газеты, і гэта ідэя?! Але ж, калі ўдумацца, стварэнне клуба — справа вельмі няпростая. Яна патрабуе шмат часу, ведаў, сродкаў, сілаў...

Да таго ж (калі па вялікім рахунку) то ён, гэты клуб — клуб прыхільнікаў роднай мовы, змагароў за яе, падпісчыкаў «Звязды» ўжо існуе — з 9 жніўня 1917 года, калі выйшаў першы нумар газеты.

Вы «за» тое, каб стаць яго сябрам? То на пошце, у кіёсках і крамах «Белсаюздруку» можна пісаць заяву (гэта значыць, запоўніць квітанцыю аб падпісцы).

Заснавана таварыства «Беларусь — Венесуэла»

Днямі ў памяшканні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі (БелТД) на сходзе грамадскасці сталіцы была заснавана новая арганізацыя: таварыства дружбы «Беларусь — Венесуэла».

Неабходнасць у ёй аб'ектыўна наспела. Апошнім часам у Беларусі з Венесуэлай адносіны развіваліся так дынамічна і рашуча, як ні з адной іншай краінай свету. У прыватнасці, адбыліся ўзаемныя візіты на вышэйшым узроўні, у ходзе якіх былі падпісаны шэраг важных дакументаў, абмяркаваны перспектыўныя накірункі беларуска-венесуэльскага супрацоўніцтва. Летась у сталіцы Венесуэлы Каракасе з вялікім поспехам прайшла першая нацыянальная выстава Беларусі пад назвай «Экспа Ферыя Беларусь-2007». Цяпер вось новы этап у гэтай актыўнай сумеснай працы — у яе ўключылася народная дыпламатыя.

Старшынёй таварыства аднадушна быў абраны рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Анатоль Маразевіч. У Акадэміі ўжо пачалі складвацца партнёрскія сувязі з роднаснай вышэйшай навучальнай установай — школай планавання пры міністэрстве планавання і развіцця Венесуэлы. У склад новай арганізацыі ўвайшло шмат вядомых у краіне людзей. Яны на сходзе выказалі намер сур'ёзна працаваць з грамадскасцю Венесуэлы. Невыпадкова намеснікам старшыні таварыства быў выбраны генеральны дырэктар «Гарызонта» Юрый Прадко. Яго вялікі арганізатарскі вопыт будзе вельмі да месца.

Вядомы навуковец, ганаровы старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Адам Мальдзіс мае свой інтарэс да гэтай краіны. Ён моцна разлічвае на тое, што членства ў таварыстве дапаможа яму знайсці звесткі аб двух беларускіх літаратарах, якіх лёс закінуў у Венесуэлу. Даследчык спадзяецца адшукаць архівы гэтых пісьменнікаў. Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі выказаў надзею, што яго ўдзел у рабоце таварыства дазволіць папоўніць фонды бібліятэкі літаратурай і інфармацыяй аб Венесуэле.

Як адзначыла старшыня БелТД Ніна Іванова, у мінскім Доме дружбы ў чэрвені пройдуць Дні Венесуэлы, прысвечаныя 197-й гадавіне абвяшчэння незалежнасці гэтай краінай. Пасол Венесуэлы ў Беларусі Амерыко Дзіяс Нуньес шчыра вітаў членаў таварыства. Ён пабачыўся з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, які ўсямерную падтрымку. Між іншым, ён паведаміў, што пасольства мяркуе неўзабаве адкрыць у Мінску свой дом, дзе будуць ладзіцца розныя мерапрыемствы. Нагадаем, у БелТД уваходзяць шэсць абласных аддзяленняў, Мінская гарадская арганізацыя, 36 таварыстваў дружбы з асобнымі краінамі. Таварыства «Беларусь—Венесуэла» стала 37-й такой грамадскай арганізацыяй.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Прапусціце «хуткую дапамогу»...

Такое прафілактычнае мерапрыемства правяла дзяржаўтаінспекцыя Гомельшчыны і ўпраўленне аховы здароўя ў абласным цэнтры, Мазыры, Рэчыцы, Светлагорску, Жлобіне, Рагачове і ў Калінкавічах. І выклікана яно было тым, што летась з удзелам машын хуткай медыцынскай дапамогі было ўчынена 11 дарожна-транспартных здарэнняў. І ў многім з-за таго, што гэтым аўтамабілям асобныя вадзіцелі не ўступалі дарогу.

У час рэйду ва ўказаных гарадах было ўстаноўлена сорак фактаў такіх парушэнняў, вінаўнікі якіх будуць трымаць адказ перад спецыяльнымі камісіямі. Ім пагражаюць штрафы ў памеры ад дзвюх да дзесяці базавых велічынь.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗБЕРАЖЭННІ СА ЗНАКАМ «МІНУС»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ДЭПАЗІТЫ: 1 150 000 РУБЛЁЎ — НА КОЖНАГА

Аднак, як кажуць, часы мяняюцца і нават горкія ўспаміны — не перашкода, каб зарабіць «лішнюю капейку». Тым болей, што і сітуацыя змянілася менавіта ў лепшы бок: галапіруючая інфляцыя засталася дзесьці ў мінулым, рубель стабілізаваўся, а банкі пачалі «песціць» укладчыкаў добрымі працэнтамі па дэпазітах. Па гэтаму, падлічыўшы ўсе «за» і «супраць», і я, нарэшце, пайшоў у банк, каб даверыць сваю сціплую «заначку» фінансавай установе. Мне, дарэчы, пашанцавала: паслухаўшы парады экспертаў газеты, якія прадказвалі рэзкі ўзлёт курса еўра, кінуў летась грошы на дэпазіт у гэтай валюце. На той час я не прагадаў, таму што адбыўся істотны скачок курса еўрапейскай валюты: у «абменніках» 1 еўра за непрацяглы перыяд «пацяжэў» амаль на 400 рублёў: толькі ў выніку гэтага з 200 еўра я дадаткова атрымаў каля 80 тысяч рублёў. Даход павялічылі і працэнты па дэпазіце, якія выплачвае банк.

Як адзначыў у размове са мной **прэс-сакратар Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл ЖУРАВОВІЧ**, большасць насельніцтва сапраўды ўжо ацаніла выгаднасць зберажэння сродкаў на дэпазітах. Да таго ж расце і давер людзей да банкаўскай сістэмы. У выніку на пачатак гэтага месяца ў айчынных банках укладны беларусаў вырасліда 11,2 трыльёна рублёў: спецыялісты падлічылі, што на кожнага жыхара рэспублікі ў сярэднім на валютных і рублёвых дэпазітах прыпадае каля 1 мільёна 150 тысяч рублёў. Заўважу, што яшчэ сем гадоў таму гэта лічба складала ўсяго каля 36 долараў у эквіваленце. Аптымістычны прагноз дае галоўны банк і на канец гэтага года: як мяркуецца, укладны могуць прырасці за 2008 год на 3,3—3,7 трыльёна рублёў, гэта значыць, што ў разліку на кожнага беларуса памер банкаўскіх зберажэнняў павялічыцца амаль да паўтара мільёна рублёў.

АДДАЁМ ПЕРАВАГУ РУБЛЮ

І гэта сапраўды так. Паводле звестак галоўнага банка краіны, для нашага насельніцтва беларускі рубель стаў больш пажаданы: укладны ў нацыянальнай валюце займаюць каля 65 працэнтаў усяго аб'ёму дэпазітаў. На карысць нацыянальнай валюты, па першае, — высокія працэнты, што прапануюць банкі па рублёвых укладах. Каб не быць галаслоўным, я звярнуўся да **намесніка начальніка аддзела рэгулявання ўкладных аперацый Нацыянальнага банка Наталлі ЯЎКІНАЙ,** якая расклала па «паліцах» леташнюю даходнасць па ўкладах на прыкладзе аднаго з вядучых банкаў рэспублікі. Праўда, у разліках не ўлічвалася капіталізацыя ўкладу, а таксама хістанні курса еўра. Дык вось, калі чалавек, напрыклад, на пачатку мінулага года паклаў на тэрміновы дэпазіт 1 мільён беларускіх рубл

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

Ул. Мясникова, 32, г. Минск, 220050.
Тел.: (017) 200 18 31. Факс: (017) 226 47 50.
Телекс: 252408 PION BY.
E-mail: info@belarusbank.by
Интернет: http://www.belarusbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 января 2008 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	401312,4	266836,8
3	Средства в Национальном банке	1102	2	731087,9	944830,2
4	Ценные бумаги: для торговли удерживаемые до погашения в наличии для продажи	1103 11031 11032 11033	 3 3.1 3.2	1193840,5 — 7,3 1193833,2	1144508,5 — 101419,3 1043089,2
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	590668,8	218842,4
6	Кредиты клиентам	1106	5	13363332,7	9703953,7
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	134274,1	48019,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	515154,0	413478,5
9	Прочие активы	1109	8	106833,9	95334,3
10	ИТОГО активы	110		17036504,3	12835803,4
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	905570,7	972738,4
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	1387668,2	1082146,0
14	Средства клиентов	1206	11	12046722,6	8679215,7
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		208834,6	82146,4
16	Прочие обязательства	1209	12	185232,5	138166,7
17	ВСЕГО обязательства	120		14734028,6	10954413,2
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	1637530,9	1437530,9
20	Эмиссионный доход	1212		—	—
21	Резервный фонд	1213		52773,1	32799,5
22	Накопленная прибыль	1214	14	378726,7	219078,8
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	233445,0	191981,0
24	ВСЕГО капитал	121		2302475,7	1881390,2
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		17036504,3	12835803,4
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	32648847,2	24229384,2
28	Обязательства	1302	17	2874040,3	1915440,2

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
за 2007 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2007 г.	2006 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		1336589,3	898461,1
2	Процентные расходы	2012		872739,8	531247,0
3	Чистые процентные доходы	201	18	463849,5	367214,1
4	Комиссионные доходы	2021		336968,7	284041,1
5	Комиссионные расходы	2022		53745,7	30665,4
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	283223,0	253375,7
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	113963,2	89082,3
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	1535,9	398,3
9	Доход в форме дивидендов	205		509,9	691,4
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	(-5099,2)	35449,3
11	Прочие доходы	207	23	43014,6	35257,7
12	Операционные расходы	208	24	624162,4	503070,1
13	Прочие расходы	209	25	42738,1	37634,7
14	Налог на прибыль	210		55787,3	47739,1
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		188507,5	122126,3
	Базовая прибыль на простую акцию (бел. руб.)			129,62	101,32
	Разводненная прибыль на простую акцию (бел. руб.)			—	—

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА
за 2007 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статей капитала / Наименование показателей	Символ	Уставный фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль (убыток)	Фонды переоценки статей баланса	Всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
1	**Раздел I. За год, предшествующий отчетному**							
2	Остаток на 1 января 2006 г.	3011	1175152,0	—	22730,8	111244,0	139263,4	1448390,2
3	Изменения статей капитала	3012	262378,9	—	10068,7	107834,8	52717,6	433000,0
	В том числе:							
3.1	прибыль (убыток со знаком «минус»)	30121	x	x	x	122126,3	x	122126,3
